№ 32 (582) 28 жніўня 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА
ISSN 1819-1614
Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## Інтэрнэт як будпляцоўка нацыі

Віртуальная нацыя — ня менш сур'ёзная і моцная супольнасьць людзей, чым папярэднія яе формы. Піша Сяргей Богдан.

Старонка 7

## Праваднік па беларускамоўных школах сталіцы

Старонка 5

## Ад Горадні да Ябланова

Ад замку да замку, ад фальварку да фальварку: маршрут для аматараў беларускіх помнікаў. Піша Альбіна Семянчук.

Старонка 8

# Расея мяняе карту сьвету

Прызнаньне Масквой незалежнасьці Абхазіі і Паўднёвай (не Паўночнай) Асэтыі і дэманстратыўнае спыненьне Расеяй працэдуры ўступленьня ў СГА паставіла сьвет у стан новай халоднай вайны. Уключэньне новых «рэспублік» у склад саюзнае дзяржавы аўтаматычна перавядзе Беларусь у ранг яшчэ адной асэтыі, толькі большага памеру. **Старонка 3.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**На фота: блёк-пост расейскіх войскаў у Горы (Грузія).**

## У НУМАРЫ

**Лукашэнка ў шпагаце**

Масква закусіла цуглі. Мядзьведзеў прызнаў незалежнасьць Паўднёвай Асэтыі ды Абхазіі, выдатна разумеючы, што гэта — клінч з Захадам. Беларусь жа, дакладней, яе кіраўніцтва, паводле нямецкага палітоляга Рара, апынулася ў шпагаце між двума патэнцыйнымі бакамі новай халоднай вайны. Ня самая зручная поза. Піша Аляксандар Класкоўскі. **Старонка 3.**

**Чэславас Юршэнас: «Захаду час адчыніць дзьверы»**

Старшыня Сойму Літвы пра гатоўнасьць ЭС зьняць санкцыі. **Старонка 4.**

**Беларускамоўная адукацыя ў ілюстрацыях**

Колькі школьнікаў у Беларусі вучацца па-беларуску — дазнацца немагчыма. Міністэрства адукацыі на сваім сайце абнаўляць гэткія зьвесткі кінула ў 2006-м. **Старонка 5.**

**Ня трэба было рваць партрэты Пуціна?**

Толькі калі апазыцыянэры перайграюць Лукашэнку ў лявіраваньні паміж Захадам і Ўсходам, тады яны адчыняць шлях да незалежнасьці. Пошта Рэдакцыі. **Старонка 10.**

**Дыскаграфія**

Басовішча, Алесь Камоцкі, Гюнэш, Сяргей Анцішын… **Старонка 12.**

**Самая пасьпяховая**

Вынікі Алімпіяды ў Пэкіне. Піша Зьміцер Панкавец. **Старонка 14.**

**Аршанская бітва — 2008**

У нядзельку параненьку… 6 верасьня. І іншыя анонсы на старонцы «Дзе варта быць». **Старонка 15.**

# Культурная рэвалюцыя

Рубінаўская рэформа рэзка скараціла гадзіны на вывучэньне замежных моваў і руйнуе спэцыялізаваныя школы.

Згодна з Дэкрэтам прэзыдэнта №15 «Аб асобных пытаньнях агульнай сярэдняй адукацыі» школьнікі будуць вывучаць замежныя мовы цяпер толькі з трэцяй клясы.

Пад пагрозай скасаваньня паглыбленыя курсы вывучэньня моваў у агульнаадукацыйных школах, ня будзе спэцыялізаваных клясаў, скарачаецца колькасьць гадзінаў на вывучэньне замежных моваў. Да новага навучальнага году застаецца менш за тыдзень, а ўцямнасьці, паводле якіх праграмаў будзе весьціся выкладаньне, няма.

Настаўнікі замежных моваў — у разгубленасьці. Многія проста сыходзяць са школы. Алеся Серада выкладала ў сталічнай гімназіі №23 кітайскую мову. Зараз у другакляснікаў, якія ўжо год вучылі мову, замежнай ня будзе — да наступнага году. Алеся зьбіраецца звальняцца.

**Працяг на старонцы 5.**

# Гэта не нічыя, гэта перамога

БАТЭ—«Леўскі» — 1:1. Хто прыедзе ў Менск: Манчэстэр, Барса, Інтэр?

Матч у адказ 3-га раўнду Лігі чэмпіёнаў завершыўся сапраўды баявой нічыёй. Ледзь пратрымаліся.

БАТЭ на 14-й хвіліне адкрыў лік. Вызначыўся Сяргей Сасноўскі. На 38-й хвіліне баўгары забілі мяч у адказ (Уладзімер Гаджаў).

Увесь другі тайм БАТЭ гуляў у меншасьці. Хлопцы стрымлівалі атакі баўгар, час ад часу робячы вылазкі на вароты гасьцей. Гульня прымушала хапацца за сэрца.

Нагадаем, што ў першым матчы, два тыдні таму ў Сафіі, БАТЭ выйграў зь лікам 1:0.

Такім чынам беларускі клюб упершыню ў гісторыі трапіў у групавы турнір Лігі чэмпіёнаў, за што атрымае 7 мільёнаў эўра.

Лішне казаць, што ўвесь Барысаў не памятае сябе ад шчасьця з нагоды перамогі землякоў.

**Ул. інф.**

БЕЗ КАМЭНТАРОЎ

## «Беларусь таксама набыла незалежнасьць досыць дзіўным чынам»

Лідэр Партыі камуністаў Сяргей Калякін — адзіны зь лідэраў Аб’яднаных дэмакратычных сілаў, хто падтрымаў Расею ў пытаньні Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі. Вось што сказаў старшыня апазыцыйных камуністаў карэспандэнту «НН»: «Абхазія і Асэтыя нічым ня горшыя за касаўскіх альбанцаў. Калі ўвесь сьвет прызнаў незалежнасьць Косава, то чаму ня можа зрабіць гэта ў дачыненьні да гэтых дзяржаваў? Народы Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі выказалі волю жыць у незалежных дзяржавах. Што тут можа быць кепскага? Прызнаньне незалежнасьці ня толькі магчымае, але і неабходнае.

Беларусь таксама павінна прызнаць волю гэтых народаў. Ні для кога не сакрэт, што і нашая краіна набыла незалежнасьць таксама досыць дзіўным чынам, калі тры чалавекі ў Белавескай пушчы падпісалі дамову аб развале СССР.

Міжнародная супольнасьць тады хуценька прызнала Беларусь як асобную дзяржаву. Таму, думаю, падобнае можа паўтарыцца і зараз».

**Запісаў Зьміцер Панкавец**

## Мудры Сталін вяртаецца ў расейскія падручнікі

Новы базавы падручнік для расейскіх школаў «История России 1900—1945» стаўся скандальна вядомым яшчэ да выхаду. У канцэпцыі падручніка прапісана: «Супраціў курсу Сталіна на фарсіраваную мадэрнізацыю й асьцярога лідэра краіны страціць кантроль над сытуацыяй былі галоўнай прычынай вялікага тэрору. Важна паказаць, што Сталін дзейнічаў у канкрэтнай гістарычнай сытуацыі, дзейнічаў як кіраўнік цалкам рацыянальна — як ахоўвальнік сыстэмы, як пасьлядоўны прыхільнік пераўтварэньня краіны ў індустрыяльнае грамадзтва, што кіруецца з адзінага цэнтру».

Адзін з аўтараў канцэпцыі падручніка, доктар гістарычных навук Аляксандар Данілаў даводзіць, што за мэту ставілася «нічога не апраўдваючы, патлумачыць людзям, як і чаму ўлады дзейнічалі менавіта так. Патлумачыць — гэта ж не апраўдаць, праўда?»

«Як жа Расея з такім курсам гісторыі зьбіраецца жыць на гэтай плянэце, — усклікае ў інтэрвію радыё «Свабода» сябра праўленьня расейскага «Мэмарыялу» Аляксандар Чаркасаў.

— Што думае Фінляндыя пра зімовую вайну, тую вайну, незнакамітую? Што з нагоды перадваенных гадоў скажуць былыя краінаў Балтыі ці Польшчы? А што з Украінай, для якой Галадамор — гэта адна з галоўных трагедый у гісторыі? Пэўна, гэты курс ня можа вырасьціць чалавека, які жыве ў міры й суседзтве зь іншымі краінамі...»

**Cz**



DARIUSS.LIVEJOURNAL.COM

**Таня Казыра ня хоча вяртацца на радзіму. «Я люблю маю краіну і маю бабулю, але там маё жыцьцё занадта цяжкае. Мая сям’я тут», — заявіла яна ў Сан-Францыска.**

# Таня Казыра адхіліла

прапановы беларускага боку аб вяртаньні на радзіму.

5 жніўня 16-гадовая Таня разам з групай беларускіх дзяцей павінна была вылецець з Каліфорніі ў Менск, аднак да прызначанага часу яна не прыбыла ў аэрапорт. Пазьней стала вядома, што дзяўчына падала ў іміграцыйную службу дакумэнты для прадаўжэньня гасьцявой візы і застаецца ў ЗША, каб дачакацца рашэньня ўладаў.

У ЗША камандзіравалі супрацоўніка МЗС Паўла Шыдлоўскага, які некалькі разоў сустракаўся з Таняй.

Паводле інфармацыі амэрыканскай газэты The Press Democrat, чыноўнік прапанаваў дзяўчынцы вярнуцца на радзіму і скончыць школу, а потым паспрабаваць атрымаць студэнцкую візу ў ЗША.

«Яна адмовілася. А мы падтрымаем любое рашэньне Тані», — цытуе выданьне Дэбару Сапату, у сям’ю якой Т.Казыра прыяжджала дзевяць гадоў запар.

«Я люблю маю краіну і маю бабулю, але там маё жыцьцё занадта цяжкае. Мая сям’я тут», — заявіла Т.Казыра.

Таня — сірата, і яе бабця ўхваляе рашэньне ўнучкі. Маўляў, хоць жыцьця пабачыць дзяўчына.

«Тысячы амэрыканскіх дзяцей едуць за мяжу і тысячы прыяжджаюць у ЗША ў рамках праграмаў па абмене, — сказаў журналістам адвакат сям’і Сапатаў. — Здарэецца, дзеці застаюцца. Але гэта не прыводзіць да дыпляматычнага скандалу. Чаму ж беларускія ўлады так рэагуюць?»

**МБ; паводле БелаПАН**

## Сурвілла заклікае не дапусьціць

падпарадкаваньня беларускай СПА Расеі. Старшыня Рады БНР зьвярнулася з адкрытым лістом да беларускага народу. «Дарагія суродзічы, — піша Івонка Сурвілла, — з жалем гляджу, як некаторыя з вас (...) верацьь крамлёўскай прапагандзе. (...) Кіраўнік беларускай дзяржавы абяцае маскоўскім сатрапам уваходзіць зь імі ў новыя «абаронныя» дамовы, якія ізноў уцягнуць наш народ у чужыя войны і зробяць яго першай ахвярай любога канфлікту Расеі з рэштай сьвету. (...) Не дазвольце, каб такое пагадненьне зьдзейсьнілася. У дачыненьні да Грузіі Расея паказала свой сапраўдны твар. (...) Гэтак, як яна напала на маленькую Грузію, гэтак яна скарыстае першую нагоду — альбо прыдумае яе, — каб прыслаць свае танкі ў Беларусь. Тады будзе запозна (...) бараніцца». «Але перад гэтым пратэстуйце ўсімі сіламі супраць заключэньня псэўдаабароннай дамовы з Расеяй, бо станецца ён нашай супольнай магілай», — завяршае свой ліст старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла.

**МБ**

## Да Польшчы нам як да месяца

Сярэдні заробак у Польшчы дасягнуў 1000 эўра на месяц, але палякі бядуюць, што ім далёка да Ірляндыі, дзе толькі мінімальны заробак складае 1,5 тысячы эўра. Тым часам, паводле Мінстату, у Беларусі сярэдні заробак работнікаў у ліпені склаў 923 тыс. 277 рублёў — 297 эўра. Г.зн. у 3,3 разы менш, чым у Польшчы, і ў 5 разоў меней, чым мінімальны заробак у колісь самай беднай краіне Эўрасаюзу — Ірляндыі.

## Усіх замялі

З 8 жніўня ў менскім сьледчым ізалятары знаходзяцца 14 супрацоўнікаў фірмы «Ўладпрадымпарт», якая пастаўляла ў Беларусь украінскія сокі «Садочак». Як паведамляе «Брестский курьер», затрыманы генэральны дырэктар, кіраўніцтва берасьцейскага і баранавіцкага філіялаў фірмы, галоўны бухгальтар і нават кіроўца.

Гэтую інфармацыю пацьвердзілі на самой фірме. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, усе затрыманыя праходзяць па справе аб выбуху ў Менску 4 ліпеня. Аднак у міліцыі сьцьвярджаюць, што ў дачыненьні да супрацоўнікаў фірмы распачатая крымінальная справа за ўхіленьне ад выплаты падаткаў. Махінацыі выявілі, як сталі патрабаваць дакумэнты на тую партыю соку, пакет зь якой выкарыстаў тэрарыст.

СЬЦІСЛА

### Вось і лета прайшло

Апошнюю пяцідзёнку лета ўмовы надвор’я ў Беларусі будуць вызначацца ў асноўным цыклёнамі. У выхадныя дні заходні вецер зьменіцца на паўночны. На Беларусь прыйдзе халоднае паветра Арктыкі, якое панізіць начную тэмпэратуру да плюс 4—9 , а ўдзень будзе плюс 14—19, толькі на Берасьцейшчыне крыху цяплей.

### Беларусы перамаглі на «Гуляйполі»

Беларуска Наста Манцэвіч перамагла на фэстывалі паэзіі «Махнофэст» ва ўкраінскім горадзе Гуляйполе. 25-гадовая Наста атрымала галоўны прыз — 300 грыўняў (каля 120 тыс. рублёў) і дзьве скрыні піва. Другое месца — у берасьцейца Сяргея Прылуцкага. У шасьцёрцы пераможцаў таксама Марыйка Мартысевіч зь Менску і Віталь Рыжкоў з Магілёву.

### Маккейн упершыню абышоў Абаму

Кандыдат у прэзыдэнты ЗША ад Рэспубліканскай партыі Джон Маккейн упершыню апярэдзіў свайго праціўніка Барака Абаму. Паводле апытаньня службы Гэлапа, за Маккейна гатовыя прагаласаваць 46% выбарцаў, за Абаму — 44%.

### Пацярпелыя ад выбуху атрымаюць ад $300 да $1600

Пацярпелыя падчас выбуху ў Менску 4 ліпеня атрымаюць матэрыяльную дапамогу. Адпаведны ўказ у аўторак падпісаў А.Лукашэнка. Тым, хто атрымаў цяжкія пашкоджаньні, будзе выплачана 3 млн 500 тыс. рублёў. Лёгка параненым — 700 тыс. руб.

### Найдаўжэйшая каса краіны

Найдаўжэйшую касу ў краіне мае доктарка-кардыёляг дзіцячай паліклінікі зь Ліды Алена Аляшкевіч. Даўжыня яе касы 165 см.

### Журналістам вяртаюць кампутары

Журналісты недзяржаўных СМІ ў рэгіёнах атрымліваюць з КДБ адабраныя сёлета ў сакавіку дакумэнты і кампутары. Ахвярамі ператрусаў і допытаў сталі 27 сакавіка амаль 20 журналістаў. Падставай быў ордэр, выдадзены па старой справе пра сатырычныя мультфільмы пра Лукашэнку.

**Ул. інф., Зьміцер Панкавец; радыё «Свабода», БелаПАН, «Звязда», «Эўрапейскае радыё для Беларусі», «Рэспубліка»**

IN MEMORIAM

### Васіль Несьцярэнка

25 жніўня на 74–м годзе жыцьця памёр дырэктар інстытуту радыяцыйнай бясьпекі «Белрад» Васіль Несьцярэнка. Навуковец памёр пасьля апэрацыі на страўніку.

Старшыня дабрачыннага фонду «Дзецям Чарнобылю» Генадзь Грушавы ўспамінае: «Васіль Несьцярэнка — адзін зь нямногіх маіх знаёмых, які ўсё жыцьцё меў і захаваў сапраўднае чалавечае аблічча.

Усё жыцьцё ён змагаўся з тымі, хто спачатку прывялі ў Беларусь Чарнобыльскую трагедыю, а пасьля спрабавалі яе схаваць. Калі за сваю цьвёрдую пазыцыю навукоўца выперлі з усіх працаў, то ён не скарыўся, а стварыў «Белрад», дзе працягваў гаварыць праўду пра радыяцыю і яе наступствы.

Спрабаваў, чым мог, дапамагчы жыхарам забруджаных тэрыторый, асабліва дзецям. З маіх знаёмых усяго некалькі чалавек так і ня кінулі гэтай ганаровай, але цяжкай працы. Сёньня я нізка схіляю галаву перад памяцьцю гэтага чалавека. Спадзяюся, што прыйдзе час, калі і памяць пра Васіля Несьцярэнку ўшануюць і на дзяржаўным узроўні».

Васіль Несьцярэнка нарадзіўся 2 сьнежня 1934 году ў Луганскай вобласьці (Украіна). Скончыў МВТВ імя Баўмана (1958). Працаваў у Акадэміі навук СССР. Ад 1963 году ў Беларусі. З 1990 году дырэктар Інстытуту радыяцыйнай бясьпекі «Белрад». Доктар тэхнічных навук, прафэсар.

Апошнія гады жыцьця Васіль Несьцярэнка быў адкрытым праціўнікам пабудовы ў Беларусі АЭС.

Пахаваньне Васіля Несьцярэнкі адбылося 27 жніўня.

**Зьміцер Панкавец**

# Расея мяняе карту сьвету

Уключэньне новых «рэспублік» у склад саюзнае дзяржавы аўтаматычна пераводзе Беларусь у ранг яшчэ адной асеціі, толькі большага памеру.

Расеі давядзецца перадрукаваць мапы сьвету: на палітычнай карце ў маскоўскай вэрсіі зьявіліся дзьве новыя незалежныя дзяржавы.

«Улічваючы свабоднае волевыяўленьне асэтынскага і абхаскага народаў (...) я падпісаў указы аб прызнаньні Расейскай Фэдэрацыяй незалежнасьці Паўднёвай Асэтыі і Абхазіі», — гаворыцца ва ўказе Дзьмітрыя Мядзьведзева.

Мядзьведзеў таксама заявіў, што Расея падтрымлівае ідэю рэфэрэндуму ў Паўднёвай Асэтыі і Абхазіі і ў гэтай сытуацыі лічыць за неабходнае падтрымаць імкненьне народаў непрызнаных рэспублік да незалежнасьці.

Пра гэта прэзыдэнт Расеі заявіў у аўторак на паседжаньні Рады Бясьпекі.

Мядзьведзеў перакананы, што Грузія спрабавала далучыць Паўднёвую Асецію цаной гібелі тысячаў мясцовых жыхароў. Ён зазначыў, што шчэ ў 1991 г. Расея выратавала насельніцтва Асэтыі і Абхазіі ад зьнішчэньня.

Мядзьведзеў падкрэсьліў, што імкненьне Расеі мірна разьвязаць канфлікт праігнаравала як сама Грузія, якая «мэтадычна рыхтавалася да вайны», так і НАТО і Эўрасаюз. Такім чынам, Пуцін—Мядзьведзеў выбралі шлях далейшага абвастрэньня стасункаў з краінамі Захаду.

«Саакашвілі абраў генацыд для вырашэньня сваіх палітычных задачаў», — так апраўдаў сваё рашэньне прэзыдэнт Расеі.

У панядзелак, 25 жніўня, пасьля рашэньня расейскай Дзярждумы пра наданьне незалежнасьці Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі, краіны Захаду зьвярнуліся да расейскага прэзыдэнта з просьбай, каб ён не падпісваў указу аб прызнаньні.

Калі стала вядома, што прызнаньне адбылося, ЗША, Эўрасаюз і АБСЭ выступілі з асуджэньнем кроку Расеі. Канцлерка Нямеччыны назвала рашэньне «абсалютна непрымальным».

Як чакаецца, ЭС дасьць канчатковую ацэнку сытуацыі на наступным тыдні: прэзыдэнт Францыі Нікаля Сарказі склікае ў сымбалічны дзень 1 верасьня саміт Эўрасаюзу, каб абмеркаваць сытуацыю ў Грузіі. Сустрэча адбудзецца ў Брусэлі.

Прэцэдэнтамі апошняга часу былі Эрытрэя, Тымор-Лештэ і Косава. У выпадку афрыканскай і азіяцкай краінаў існаваў кансэнсус міжнароднае супольнасьці. У выпадку Косава рашэньне прымалася супольна заходнімі вялікімі дзяржавамі і ісламскімі краінамі, нягледзячы на скепсіс ці супраціў Расеі і Кітаю, і было падтрыманае шасьцю дзясяткамі краінаў.

Выпадак Асэтыі і Абхазіі розьніцца тым, што Расея дзейнічае аднаасобна. Кітай стаіць за прынцып тэрытарыяльнае цэласнасьці, а Маскву на сёньня афіцыйна падтрымалі толькі чатыры краіны ва ўсім сьвеце — Беларусь, Вэнэсуэла, Куба і Сырыя. Сытуацыя блізкая да таго, якую мае Турцыя з Рэспублікай Паўночнага Кіпру.

Грузія вуснамі намесьніка міністра замежных справаў назвала рашэньне Масквы «актам анэксіі грузінскіх тэрыторый» і заявіла, што для Грузіі гэта ня будзе мець ніякага юрыдычнага значэньня.

Прэзыдэнт жа Абхазіі Сяргей Багапш назваў дзень 26 жніўня «гістарычным» для свайго народу.

Дзеяньні Масквы будуць мець працяглы ўплыў на міжнародную сытуацыю. Яны павышаюць шанцы на перамогу кандыдата-рэспубліканца Джона Маккейна на прэзыдэнцкіх выбарах у ЗША. Яны зьмяняюць таксама ўнутрыпалітычнае становішча ва ўсходнеэўрапейскіх краінах. Гэтак, стала вядома, што лідэр Партыі рэгіёнаў Украіны Віктар Януковіч заклікаў Кіеў прызнаць незалежнасьць падрасейскіх тэрыторый.

Выключнае значэньне для далейшага разьвіцьця краіны мае выбар беларускага кіраўніцтва ў гэтай сытуацыі.

Масква будзе патрабаваць, каб Беларусь прызнала незалежнасьць васальных тэрыторый Расеі. У той жа час ўключэньне новых «рэспублік» у склад саюзнае дзяржавы аўтаматычна пераводзе Беларусь у ранг яшчэ адной асэтыі, толькі большага памеру.

Таксама і простае прызнаньне Менскам незалежнасьці новых дзяржаваў прывядзе да ўзмацненьня ізаляцыі Беларусі ў Эўропе — нашая краіна ўмацуе свой імідж «кліента Масквы».

Тым ня менш, выключаць такое разьвіцьцё падзеяў не выпадае. За апошнія 10 гадоў Беларусь прыняла лічаныя самастойныя рашэньні на міжнароднай арэне. Масква ж па-ранейшаму выкарыстоўвае льготныя цэны на газ і нафту для ціску.

Лукашэнка быў адзіным кіраўніком дзяржавы, акрамя расейскага, які сустрэўся з прэзыдэнтамі Асэтыі і Абхазіі і выказаў на тым спатканьні думку, што «і народ Асэтыі, і народ Абхазіі ў складзе Грузіі жыць не могуць».

**Мікола Бугай**

КАМЭНТАРЫ

# Лукашэнка ў шпагаце

Масква закусіла цуглі. Мядзьведзеў прызнаў незалежнасьць Паўднёвай Асэтыі ды Абхазіі, выдатна разумеючы, што гэта — клінч з Захадам. Беларусь жа, дакладней яе кіраўніцтва, паводле нямецкага палітоляга Рара, апынулася ў шпагаце між двума патэнцыйнымі бакамі новай халоднай вайны. Ня самая зручная поза. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Расея працягвае «ўставаць з каленяў» так, як яна гэта разумее: зараз усім па пысе надаем! Каўкаская «вікторыя» ап'яніла. Ужо і супрацу з НАТО паслалі падалей, і Ўсясьветная гандлёвая арганізацыя па барабане. Галоўнае — паказаць «грызунам», «піндосам» ды іншым «кузькіну маць».

І вось на гэтым фоне Брусэль ды Вашынгтон апынуліся перад беларускай дылемай. З аднаго боку, зразумела, што змушанае вызваленьне палітвязьняў толькі пры вялікай долі фантазіі можна падагнаць пад графу «Дэмакратызацыя». Сапраўднай дэмакратызацыі тутэйшая вярхоўка баіцца як чорт крыжа, бо зь любасьцю адбудаваная сыстэма «аднаго палітыка» рассыпецца ў друз як вокам міргнуць.

Зь іншага боку, калі ня даць беларускаму кіраўніцтву нейкай моркаўкі, то ўся адліга — кату пад хвост, а гэта толькі і патрэбна Расеі. Яна чакае моманту, калі Беларусь нарэшце можна будзе ўзяць голымі рукамі.

Між тым тытульная апазыцыя нэрвуецца, каб Захад яе ня «здаў», ладзячы прагматычныя стасункі зь цяперашнім рэжымам. Варта толькі камусьці зь летувіскіх, польскіх ці іншых эўрапейскіх палітыкаў закінуць тэзу пра больш гнуткі падыход, як зь лягеру змагароў-максымалістаў чуецца: ніякіх кампрамісаў з самі-ведаеце-якім рэжымам!

Наконт цудадзейнай перакоўкі рэжыму ілюзіяў, бадай, няма ні ў кога. Але, у рэшце рэштаў, ці не зашмат асобныя нашыя дэмакраты хочуць ад Захаду?

Наколькі карэктна патрабаваць ад заходнікаў, каб яны пераймаліся пытаньнем сьветлай дэмакратычнай будучыні Беларусі мацней, чым маса «тутэйшых»?

На думку менскага палітоляга Андрэя Фёдарава, можа скласьціся парадаксальная сытуацыя, калі дзеля ўратаваньня беларускай незалежнасьці Захаду давядзецца трохі прыплюшчыць вочы на асобныя хібы рэжыму і пайсьці на шчыльнейшую супрацу зь ім, не чакаючы з мора пагоды (то бок вялікага прагрэсу ў выкананьні сакрамэнтальных 12 умоваў). Са словаў Фёдарава, «Эўропа і Штаты разумеюць, што калі Масква паглыне Беларусь, а потым стане тачыць зубы і на Ўкраіну, то такой Расеі ўжо не дасі рады».

Палітоляг Дзяніс Мельянцоў зазначае: такога пахаладаньня ў дачыненьнях Расеі з Захадам яшчэ не было. «Беларускі рэжым прызвычаіўся лавіраваць, — кажа ён, — але цяпер, пры такой палярызацыі, давядзецца жорстка выбіраць». Альтэрнатыва: або далучацца да заходняй супольнасьці і рабіць комплексныя рэформы, або далучацца да Расеі (ці, ва ўсякім разе, цалкам ператварацца ў марыянэтку). Іначай кажучы, Беларусь цяпер у пункце біфуркацыі, і вынік прадказаць цяжка.

«Стратэгія Захаду мусіць палягаць у тым, каб выкарыстоўваць усе магчымасьці дзеля нарошчваньня сваёй прысутнасьці тут, узмацняць вагары ўплыву на беларускую сытуацыю. Апазыцыя ў пэўных выпадках ня мусіць занадта цягнуць коўдру на сябе, бо стаіць пытаньне пра выжываньне краіны. Калі трапім пад Расею, то гэта будзе калі не назаўжды, дык на гадоў 50—60 дакладна», — лічыць Дзяніс Мельянцоў.

Ну а пакуль што, як бачым, замест адзінага рубля Менску вырашылі накінуць адзіную сыстэму супрацьпаветранай абароны. А гэта, я вам скажу, страта ці ня большага кавалку сувэрэнітэту, чым як пры згодзе на расейскую валюту. Увогуле войскі СПА дзьвюх краінаў шчыльна ўзаемадзейнічалі і дасюль.

Фішка ж новай дамовы пра СПА ў тым, каб камандны пункт быў у Расеі. То бок, калі што якое, іхны генэрал аддасьць загад мачыць імпэрыялістаў, не пытаючыся ў мясцовага правадыра.

Аналітык Валер Карбалевіч лічыць, што ніякай пэўнай замежнапалітычнай стратэгіі ў афіцыйнага Менску няма. «Беларускае кіраўніцтва проста вядзе азартную гульню, даючы безадказныя абяцаньні і Захаду, і Расеі. Але прадаць той самы тавар двум пакупнікам ня ўдасца. Аднаго давядзецца «кінуць», — мяркуе эксьпэрт.

Зараз беларускае кіраўніцтва паспрабуюць «нахіліць», каб прызнала незалежнасьць двух мяцежных анклаваў. Дык ці доўга папэнцыць трымаць той шпагат?




**Праваслаўнаму актывісту зь Беласточчыны цяжка зразумець, за што ваюють расейцы і грузіны. На фота: хата ў Кнаразах (Падляшша). Чалавек памаляваў сваё жытло ў сьцягі ўсіх праваслаўных дзяржаваў.**

СЬЦІСЛА

### «Мы разьлічваем на Беларусь»

Пасол Расеі Аляксандар Сурыкаў заявіў, што Расея разьлічвае на прызнаньне сувэрэнітэту Паўднёвай Асэтыі і Абхазіі з боку Беларусі. «Гэта сувэрэннае права Беларусі — прызнаваць ці не прызнаваць незалежнасьць, але мы ў гэтым прызнаньні разьлічваем на Беларусь, як на аднаго з самых блізкіх саюзьнікаў». Ён ня выключыў магчымасьці ўступленьня ў будучыні Паўднёвай Асэтыі і Абхазіі ў саюз Беларусі і Расеі ды СНД.

### Эўрасаюз «рашуча асуджае» рашэньне Расеі

Эўрапейскі саюз «рашуча асуджае» рашэньне Расеі аб прызнаньні незалежнасьці Паўднёвай Асэтыі і Абхазіі. Аб гэтым гаворыцца ў распаўсюджанай 26 жніўня заяве цяперашняга старшыні ЭС — Францыі. У дакумэнце падкрэсьліваецца, што рашэньне Расеі «супярэчыць прынцыпам незалежнасьці Грузіі, яе сувэрэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасьці, прызнанай Хартыяй ААН, фінальнаму акту канфэрэнцыі па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Эўропе і адпаведным рэзалюцыям Рады Бясьпекі».

Міністар замежных справаў Францыі, якая цяпер старшыню е ў ЭС, Бэрнар Кушнэр, ня выключыў, што далей Расея можа выставіць тэрытарыяльныя прэтэнзіі Ўкраіне (Крым) і Малдове.

# Чэслававс Юршэнас: «Захаду час адчыніць дзьверы»

Старшыня Сойму Літвы ініцыяваў разгляд пытаньня зьмякчэньня зносінаў зь Беларусьсю на канфэрэнцыі сьпікераў парлямэнтаў дзяржаваў Паўночнай Эўропы і краінаў Балтыі.



У Юрмале (Латвія) прайшла канфэрэнцыя сьпікераў парлямэнтаў дзяржаваў Паўночнай Эўропы і краінаў Балтыі. Сярод галоўных тэмаў, што былі абмеркаваныя, — расейска-грузінскі канфлікт, лёс Лісабонскай дамовы, энэргетычныя пытаньні. Старшыня Сойму Літвы Чэслававс Юршэнас ініцыяваў абмеркаваньне на сустрэчы прапановы аб зьмякчэньні зносінаў зь Беларусьсю.

НН зьвязалася па тэлефоне з Чэслававсам Юршэнасам, які ласкава згадзіўся адказаць на нашыя пытаньні.

Чаму падобная прапанова была агучаная цяпер? Што падштурхнула літоўскі бок да падобных прапановаў? Спадар Юршэнас адказаў:

— Нам усім варта рэагаваць на тыя падзеі, якія адбываюцца апошнім часам у суседняй Беларусі. Гэта ў першую чаргу датычыць нас, Літвы. Думаецца, калі зробленыя некаторыя пазытыўныя крокі, якія вітаюцца ўсім сьветам, як вызваленьне спадара Казуліна і іншых палітвязьняў, то Захад павінен зрабіць крок у адказ.

А так як Беларусь — рэгіён, які прымыкае да Літвы, то фармат саміту кіраўнікоў парлямэнтаў дазваляе вольна абмяркоўваць тыя ці іншыя рашэньні гэтага пытаньня. А як потым будуць дзейнічаць урады і прэзыдэнты — гэта іхная справа. Тутэйшую палітыку ў жыцьцё праводзяць менавіта яны. Але абмяркоўваць і прапаноўваць мы маем права і, спадзяюся, будзем дзейнічаць.

Цікавімся, наколькі папулярнай у Літве зьяўляецца ідэя паляпшэньня стасункаў зь Беларусьсю?

— Думаю, што такіх палітыкаў, як я, у Літве дастаткова. Канечне, я не скажу, што так думаюць усе, але такія дакладна ёсьць і іх нямала. У нас восеньская сэсія пачынаецца толькі 10 верасьня, таму раней за гэты тэрмін беларускае пытаньне абмеркаваць не атрымаецца.

Якія крокі павінна зрабіць Беларусь, каб пачаліся перамовы з эўрапейскімі краінамі?

— Не хачу нічога дыктаваць беларускім уладам. Калі казаць агульнымі словамі, то яшчэ болей дэмакратыі нікому не зашкодзіць.

У паляпшэньні стасункаў зь Беларусьсю зацікаўленыя толькі суседнія краіны Эўрасаюзу, ці старая Эўропа таксама?

— Чаму не? Старая Эўропа ня хоча напружанасьці, ня хоча нацягнутых дачыненьняў паміж суседнімі краінамі. Нагадаю, калі нас прымалі ў Эўрасаюз і НАТО, то нас ацэньвалі і паводле такога парамэтру, як урэгуляваньне стасункаў з усімі суседзямі. Гэта цэніцца Старой Эўропай, ёй новыя канфлікты не патрэбныя. Разам з тым, Эўропа мае трывалыя прынцыпы, таму такое строгае стаўленьне да вашай краіны. Але на такія зьмякчальныя крокі беларускіх уладаў, думаю, мы павінны рэагаваць, — працягвае Чэслававс Юршэнас.

Сьпікер пацьвярджае, што сваю пазыцыю па пытаньні Беларусі ён узгадняў з міністрам замежных справаў Літвы, былым пасьлом у Беларусі, Пятрасам Вайцякунасам.

— Мы разам вельмі даўно працуем. Я ўпершыню еду на такую сустрэчу, таму хацеў крыху ўдакладніць свае пазыцыі адносна розных краінаў.

«Думаю, што нам варта пра гэта падумаць — прыняць тыя сыгналы, якія пасылае Беларусь. Варта многае мяняць у палітыцы, эканоміцы, сфэры дачыненьняў зь Беларусьсю», — цытуюць міністра літоўскія СМІ.

**Зьміцер Панкавец**

# Амэрыка бачыць пэрспэктыву

Місія Дэвіда Мэркела выглядала спробай заахвоціць беларускую ўладу да дэмакратызацыі.

Рэакцыя ЗША на вызваленьне палітвязьняў не прымусіла сябе доўга чакаць. Ужо на наступны дзень пасьля выхаду з турмы Андрэя Кіма і Сяргея Парсюкевіча Дзяржздэпартамэнт распаўсюдзіў прэс-рэліз аб сытуацыі ў Беларусі. «ЗША вітаюць вызваленьне апошніх палітвязьняў, якое стала працягам вызваленьня Аляксандра Казуліна — адзначаецца ў заяве прэс-сакратара Дзяржздэпартамэнту Робэрта Вуда. — Вызваленьне гэтых асобаў, якое, як мы спадзяемся, будзе спалучанае з далейшымі пазытыўнымі крокамі, адкрывае рэальную магчымасьць для значнага паляпшэньня дачыненьняў паміж ЗША і Беларусьсю».

А ўжо 21 жніўня ў Менск прыляцеў намесьнік памочніка дзяржаўнага сакратара ЗША Дэвід Мэркел. Апошні раз візыт такога ўзроўню адбываўся ў красавіку 2007 г. Тады, пасьля перамоваў Дэвіда Крэймэра (тады ён займаў пасаду Мэркела) і намесьніцы кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Натальлі Пяткевіч, на волі апынуліся некалькі палітзьняволеных.

Пра тое, што сёлетні візыт высокага амэрыканскага чыноўніка адбываецца ў цалкам іншых абставінах, сьведчыць і тое, што, у адрозьненьне ад Крэймэра, Мэркел ня меў візавых праблемаў. Беларускую візу атрымаў імгненна, як пальцамі пстрыкнуць, прызнаўся ён журналісту «Камсамолкі».



SVABODA.ORG

**Дэвід Мэркел**

Намесьнік памочніка дзяржсакратара ЗША ў справах Эўропы і Эўразіі Дэвід Мэркел — своеасаблівы ўчастковы амэрыканскага дзяржздэпартамэнту па нашым рэгіёне. Ён даўно сочыць за лёсам беларускіх палітвязьняў і менавіта зь ягоных вуснаў неаднаразова гучала, што іх вызваленьне — умова для дыялёгу зь беларускімі ўладамі.

Сёлета ў інтэрвію БелаПАН Мэркел казаў, што на пачатку году «беларускія ўлады ўсімі сіламі намагаліся прадухіліць уступленьне ў сілу канкрэтызацыі санкцый у дачыненьні да канцэрну «Белнафтахім».

Перад тым як трапіць на працу ва ўрад ЗША Мэркел назіраў за выбарамі ў эўразійскіх краінах і ўзначальваў Фонд Эўразіі.

У 2003–м стаў намесьнікам памочніка сакратара па міжнародных пытаньнях у Мінфіне ЗША. У 2005–м перайшоў на працу ў Нацыянальную раду бясьпекі дырэктарам па Эўропе ды Эўразіі. Пасьля стаяў на чале аддзелу Цэнтральнай Азіі. З сакавіка 2008 у рангу памочніка намесьніка дзяржсакратара ЗША па Эўропе ды Эўразіі, курыруе палітыку ў дачыненьні да Беларусі, Малдовы, Расеі, Украіны, пытаньні нераспаўсюду ядравай зброі.

**Падрыхтаваў АК**

Ужо ў першы дзень знаходжаньня ў Беларусі Мэркел сустрэўся зь міністрам замежных справаў Сяргеем Мартынавым. «У ходзе сустрэчы быў дэталёва разгледжаны ўвесь спэктар беларуска-амэрыканскіх стасункаў», — праінфармавалі ў прэсслужбе зьнешнепалітычнага ведамства Беларусі. Болей ніякіх падрабязнасьцяў не было. Няма іх і дагэтуль.

У пятніцу ж у пасольстве ЗША прайшла дзьвюхгадзінная сустрэча Дэвіда Мэркеля з прадстаўнікамі апазыцыі. На сустрэчы прысутнічалі лідэры АДС Анатоль Лябедзька, Вінцук Вячорка, Сяргей Калякін, былыя палітвязьні Аляксандар Казулін, Павал Севярынец, Мікола Статкевіч, намесьнік старшыні «Руху «За Свабоду» Віктар Карняенка, старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна, праваабаронца Алесь Бяляцкі.

Галоўнымі пытаньнямі сустрэчы былі палітвязьні і будучыя парлямэнцкія выбары. Калі ў першым пытаньні абодва бакі ўгледзелі канкрэтныя зрухі, дык у другім усё выглядала больш пэсымістычна. «Мы расказалі пра цэлы шэраг парушэньняў і ўціску на актывістаў, што папярэднічаюць выбарчай кампаніі, — расказаў В.Карняенка, — пра мінімальны працэнт апазыцыі ва ўчастковых выбарчых камісіях».

Мэркел паведаміў, што ягоны візыт адбыўся на асабістае распараджэньне дзяржсакратара ЗША Кандалізы Райз, і яго можна ацэньваць як гатоўнасьць ЗША да далейшага разьвіцьця дыялёгу.

«Прадстаўнік Белага Дому зазначыў, што пытаньне прызнаньня легітымнасьці выбараў залежыць не ад удзелу, ці няўдзелу апазыцыі, а ад агульнай хады кампаніі. Для нас гэта вельмі важна, бо адпавядае нашым поглядам», — адзначыў Анатоль Лябедзька.

Што ж могуць атрымаць улады, калі парлямэнцкія выбары пройдуць па адносна дэмакратычным сцэнары? «Думаю, Амэрыка будзе гатовая да скасаваньня эканамічных ці палітычных санкцый супраць Беларусі, але канкрэтна пра гэта гаворка пакуль не вялася», — зазначае старшыня АГП.

Паводле ацэнкі В.Карняенкі, мэтай гэтага візыту была «дэманстрацыя таго, што Амэрыка бачыць пэрспэктывы ў разьвіцьці дачыненьняў зь Беларусьсю».

Не зьмянілася пазыцыя ЗША і адносна таго, што магчымыя перамовы павінны быць трохбаковымі, з удзелам апазыцыі, зазначае А.Лябедзька.

У пятніцу Мэркел меў сустрэчы ў Адміністрацыі прэзыдэнта з Натальляй Пяткевіч і ў Цэнтрвыбаркаме зь Лідзіяй Ярмошынай. Пасьля гэтага, у інтэрвію «Комсомольской правде в Белоруссии» ён расставіў акцэнты, найважнейшыя для ЗША ў стасунках з нашай краінай: «Мы на многае будзем **зьвяртаць увагу ў працэсе падрыхтоўкі выбараў**. Мы будзем сачыць за рэгістрацыяй кандыдатаў, за ўмовамі іхнага доступу да выбарцаў — гэта доступ да СМІ і магчымасьць праводзіць сустрэчы. Важны склад выбарчых камісій. Думаю, гэта супадае з тым, на што зьвяртае ўвагу ЭС і місія назіральнікаў АБСЭ. Таксама нас непакоіць **стан здароўя амэрыканскага грамадзяніна, спадара Зэльцэра**, які знаходзіцца ў зьняволеньні ў Беларусі, ці атрымлівае ён неабходныя мэдыкамэнты. Мы зацікаўленыя ў **нармальных стасунках з нашым пасольствам** тут. Калі ўлады створаць спрыяльныя магчымасьці, і кандыдаты, і выбарцы змогуць браць удзел у выбарах, гэта будзе крокам да паляпшэньня стасункаў».

Візыт Дэвіда Мэркела ня быў паваротным у вырашэньні асноўных беларуска-амэрыканскіх праблемаў, як санкцыі супраць «Белнафтахіму», вяртаньне дыпляматаў ці адмена забароны беларускім чыноўнікам уязджаць на тэрыторыю ЗША. Місія Мэркела выглядала заахвочвальнай. Гэта спроба глянуць, да якой ступені гатовая дэмакратызавацца ўлада. І наступны экзамэн — парлямэнцкія выбары.

**ЗП**

# Культурная рэвалюцыя

Працяг са старонкі 1.

### У ліцэях і гімназіях будуць факультатывы

Дырэктарка сталічнай гімназіі №2 з паглыбленым вывучэньнем француcкай мовы тлумачыць, што ў ліцэях і гімназіях даецца больш самастойнасьці ў вызначэньні колькасьці гадзінаў кіраўніцтву навучальнай установы. Мовы будуць вывучацца на тым самым узроўні за кошт факультатываў: «Паглыбленая замежная мова застаецца, але не адразу, гімназічныя клясы пачынаюцца зь пятай клясы. Мы будзем выраўляць гэтую сытуацыю за кошт факультатыву».

Першаклясьнікі па жаданьні ў гімназіі №2 будуць вывучаць францускую мову факультатыўна. Праблема ўзьнікае з тымі дзецьмі, якія вывучалі мову ў першай клясе гімназіі, а цяпер ідуць у другую клясу, дзе замежнай мовы ня будзе.

Некаторыя дырэктаркі інтэрпрэтуюць закон так, што «дырэктар мае права разьмяркоўваць гадзіны і даваць магчымасьць вывучаць замежную мову, калі дзеці гэта пачалі ў першай клясе». Таксама сёй-той уводзіць замест урокаў мовы «ўрокі знаёмства з краінай».

### Канец спэцшколам

Не пашанцавала школам, якія ня мелі статусу гімназіяў і ліцэяў, але дзе замежныя мовы вывучаліся на паглыбленым узроўні. Раней на іх распаўсюджваўся навучальны плян ліцэяў і гімназіяў. У гімназіях і ліцэях захаваўся гэты плян, а ў такіх школах — не. А паколькі настаўнікі займаліся нават не на павышаным узроўні — па 3 гадзіны на тыдзень, а на паглыбленым — 6 гадзінаў на тыдзень, то палова настаўнікаў там цяпер застаюцца бяз працы. І ў такіх школах выхад таксама шукаюць у арганізацыі «факультатыўных заняткаў».

У сувязі з гэтым востра паўстала пытаньне: а ці можна браць настаўніка толькі на факультатыўныя заняткі? Раней такое было катэгарычна забаронена. Але сёлета быццам бы гэта будзе дазволена, бо вельмі шмат настаўнікаў застанецца без асноўнай загружанасьці, без гадзінаў, як кажуць у школах. Такім школам «рэкамэндавана захаваць вывучэньне замежнай мовы на паглыбленым узроўні на факультатыве (2 гадзіны ў раскладзе, адна — на факультатыве)», паведаміла Мінадукацыі.

Праўда, факультатыў па вызначэньні азначае неабавязковае наведваньне. А гэта дэзарганізуе вучняў. І яшчэ праблема — падручнікі.

Ясная справа, многія факультатывы будуць платнымі. Настаўніца кітайскай мовы Алеся Серада ня стрымлівае сваіх пачуцьцяў: «Куды нас вядзе рэформа адукацыі? Урэшце вывучаць мову толькі тыя дзеці, каму хопіць сілаў вучыцца пасьля школы, пасьля ўрокаў. Альбо такія дзеці, у чыіх бацькоў хопіць грошай, каб займацца ў рэпэтытараў».

**Іна Студзінская, радыё «Свабода»**

### Не пасьпелі

У Беларусі ня выдадзеныя падручнікі па прадметах «Грамадазнаўства» і «Чарчэньне», што ўведзеныя ў курс сярэдняй школы сёлета. Для падручніка па грамадазнаўстве аўтарамі матэрыял падрыхтаваны. Падручнік будзе выданы да 2009/2010 навучальнага году. Рукапіс падручніка па чарчэньні таксама падрыхтаваны.

**БелаПАН**

### Ці зачэпіць адукацыйная рэформа апальных ліцэістаў?

Кіраўніцтва зачыненага ўладамі Гуманітарнага ліцэю ня мае намеру істотна карэктаваць навучальныя праграмы ў зьвязку з адукацыйнай рэформай.

Днямі ліцэісты вярнуліся пасьля летняй сэсіі ў Польшчы і цяпер да пачатку кастрычніка будуць на вакацыях. Фактычна да заняткаў яны прыступяць, калі іхныя школьныя сябры адвучацца ў новых умовах месяц.

Цяпер галоўнае для ліцэя пытаньне — колькі гадоў будуць навучацца дзеці, якія перайшлі на трэці курс? «Ахвяры» няўдалага дзяржаўнага экспэрыманту — падлеткі 1991—1992 гадоў нараджэньня — рыхтаваліся пад 12–гадовае навучаньне ў сярэдніх школах, але ў выніку рэформы будуць выпускацца на год раней. У Ліцэі навучаньне вядзецца чатыры гады, але фармальна ў зьвязку з рэформай трэцякурсьнікі таксама мусяць закончыць навучаньне дачасна.

Адкрытым застаецца і пытаньне праграмаў. Перадусім, па якіх дапаможніках будуць навучацца ліцэісты? Наколькі яны будуць прывязаныя да мэтодыкаў, якія яшчэ толькі распрацоўваюцца для сярэдніх школаў? Дагэтуль яны займаліся ў асноўным па кнігах, выпушчаных неўзабаве пасьля атрыманьня Беларусьсю незалежнасьці. Пакуль нават невядома, якія кнігі будуць у школе, таму спачатку трэба дачакацца тых кнігаў, па якіх будуць вучыцца ў сярэдніх школах. А ўжо потым ліцэй будзе вырашаць, па якіх падручніках займацца.

Адсутнасьць спрыяльных умоваў на радзіме не перашкаджае ліцэістам атрымліваць добрую адукацыю. Выпускнікі ліцэю паступаюць у найлепшыя вышэйшыя навучальныя ўстановы па ўсёй Эўропе, шмат хто працягвае навучаньне ў беларускіх ВНУ.

**Радыё «Свабода»**

# Беларускамоўная адукацыя ў ілюстрацыях

Колькі школьнікаў у Беларусі вучацца па-беларуску — дазнацца немагчыма. Міністэрства адукацыі на сваім сайце абнаўляць гэткія зьвесткі кінула ў 2006-м.

Старшыня ТБШ Алесь Лозка кажа, што спробы высьветліць, які сёньня стан зь беларускамоўнай адукацыяй, натыкаюцца на глухую сьцяну: «Мы некалькі разоў зьвярталіся ў Мінадукацыі, але не атрымалі ніякага адказу, нават адпіскі».

Можна ўявіць, што ганарыцца няма чым, — дастаткова зірнуць на тэндэнцыю да выцісканьня беларускай мовы з школаў да 2006 году.

З таго, што вядома, — сёлета не адчыніцца 91 школа. Усе яны былі вясковыя, і, паводле спадара Лозкі, пераважна беларускамоўныя:

У Віцебскай вобласьці зачынілі 30 школаў,

у Менскай вобласьці — 20 школаў

у Магілёўскай вобласьці — 13 школаў

у Гарадзенскай вобласьці — 12 школаў

у Гомельскай вобласьці — 9 школаў

у Берасьцейскай вобласьці — 7 школаў

Паводле спадара Лозкі, калі бацькі хочуць вучыць дзіцё па-беларуску, гэта становіцца іхнай праблемай. Яны мусяць самі сабраць цэлую клясу, каб начальства палічыла выкладаньне па-беларуску мэтазгодным. «Калі мы спрабавалі знайсьці бацькоў, якія б аддалі дзетак у беларускамоўную клясу, нам не дазвалялі нават наклеіць абвестку ў школе, — распавядае Алесь Лозка. — А калі бацькі тэлефанавалі да дырэктара, той адказваў, што ў іх няма ніводнай заявы на беларускамоўнае навучаньне, таму, маўляў, запісвайцеся ў расейскамоўную клясу».

Дый самі бацькі, бывае, выступаюць супраць беларускай мовы. Некаторыя ня супраць увогуле адмовіцца ад урокаў беларускай мовы. Гэткае пытаньне сустрэлася на форуме Міністэрства адукацыі.

Летась паводле жаданьня большасьці бацькоў статус беларускамоўнай страціла глыбоцкая школа №3 — апошняя гарадзкая беларускамоўная школа на Віцебшчыне.

А нават калі дзіцяці і пашанцуе трапіць у беларускамоўную школу, гэта ня значыць, што ён будзе чуць сваю мову паўсюль. Фізкультура, замежныя мовы, інфарматыка часта вядуцца па-расейску — «з тэхнічных прычынаў». Напрыклад, для ўрокаў інфарматыкі чыноўнікі ад адукацыі дасюль не парупіліся пра беларускамоўнае праграмнае забесьпячэньне, хоць зьбеларусізаваць праграму — не праблема нават для юзэраў-энтузіястаў.

**Падрыхтаваў Андрэй Кузьнечык**




**Колькасьць школьнікаў, што вучыліся па-беларуску, у адсотках, па гадах.**

| | 1998/1999 | 1999/2000 | 2000/2001 | 2001/2002 | 2002/2003 | 2003/2004 | 2004/2005 | 2005/2006 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| г.Менск | 11,2 | 9,5 | 8,4 | 7,3 | 6,4 | 5,1 | 4,2 | 3,6 |
| Берасьцейская | 32,0 | 30,7 | 30,2 | 28,8 | 27,6 | 26,9 | 26,4 | 28,5 |
| Віцебская | 25,2 | 25,9 | 24,5 | 23,8 | 23,0 | 23,1 | 21,5 | 21,0 |
| Гомельская | 20,7 | 20,4 | 20,3 | 19,8 | 18,9 | 18,4 | 18,6 | 17,3 |
| Гарадзенская | 51,0 | 50,3 | 48,3 | 45,9 | 41,9 | 38,1 | 35,2 | 31,9 |
| Менская | 54,4 | 54,0 | 52,6 | 50,8 | 47,9 | 44,5 | 42,6 | 43,0 |
| Магілёўская | 22,1 | 22,9 | 21,6 | 21,0 | 20,8 | 19,9 | 20,5 | 18,8 |
| Усяго | 30,5 | 30,0 | 29,0 | 27,8 | 26,3 | 24,8 | 23,8 | 23,3 |

### Праваднік па менскіх беларускіх школах

Школаў зь беларускай мовай навучаньня ў двухмільённай сталіцы пакуль усяго шэсьць:

Гімназія №4, (вул.Кунцаўшчына, 18)

Гімназія №14 (вул.Васьняцова, 10)

Гімназія №9 (вул.Сядых, 10)

Гімназія №23 (пр.Незалежнасці, 45)

Гімназія №28 на базе сярэдняй школы №2 (Ракасоўскага, 93)

Школа №60 (Лібкнехта, 82)

Шэсьць школаў — гэта мала ў параўнаньні зь іншымі нацыямі. Але гэта шмат у параўнаньні з савецкім часам, калі на ўвесь Менск не было ніводнае.

Гонар і слава тым пэдагогам і бацькам, якія трымаюць беларускамоўныя школы на сваім энтузіязьме.

**Падрыхтаваў АК**

# Алімпійскі спакой

Алімпійскія гульні ўсё больш ператвараюцца ў пампэзнае, безгустоўна-папсовае шоў. Піша **Віталь Тарас**.

За некалькі дзён да завяршэньня пэкінскай Алімпіяды духоўны лідэр Тыбэту Далай-Лама паведаміў у Парыжы, што, паводле ягонай інфармацыі, кітайскія ўрадавыя войскі толькі за апошні час застрэлілі 150 тыбэцкіх дэманстрантаў. На гэтую інфармацыю мала хто зьвярнуў увагу.

Яшчэ напярэдадні адкрыцьця XXIX Алімпійскіх гульняў амэрыканскі часопіс Time апублікаваў артыкул пад саркастычнай назвай: «Як палітыкі байкот Алімпійскіх гульняў байкатавалі». Партал «Газэты Выборчай» (gazeta.pl) перадрукаваў гэты артыкул, дадаўшы да яго сатырычны каляж. Кожнае зь пяці алімпійскіх кольцаў упрыгожвалі фатаграфіі кіраўнікоў пяці дзяржаваў: Аляксандра Лукашэнкі, прэзыдэнта Бразыліі Лулы да Сільвы, КНР — Ху Цзіньтао, ЗША — Джорджа Буша і кіраўніка польскага ўраду Доналда Туска. Усе яны, за выключэньнем Туска, узялі ўдзел у цырымоніі адкрыцьця Алімпіяды ў Пэкіне.

Пачатак яе супаў з пачаткам вайны ў Грузіі, што зусім не адбілася на гульнях, як і гвалт у Тыбэце. Да пачатку зімовых Алімпійскіх гульняў 2014 у Сочы застаецца пяць з паловай гадоў, але ўжо цяпер ясна, што размовы пра магчымасьць пераносу Алімпіяды з Расеі ў іншую краіну праз яе палітыку на Каўказе так і застануцца размовамі.

### Кітайскія цырымоніі

Сярод кіраўнікоў дзяржаваў адмовіліся ад паездкі ў Пэкін (на адкрыцьцё) прэзыдэнты Польшчы Лех Качыньскі, Украіны Віктар Юшчанка, Літвы Валдас Адамкус, Эстоніі Томас Гэндрык Ільвэс. Тыя самыя кіраўнікі першымі наведалі Тбілісі, каб выказаць салідарнасьць з народам Грузіі. Да іх далучыўся яшчэ прэзыдэнт Латвіі Валдыс Затлерс, які на цырымоніі ў Пэкіне прысутнічаў.

На самой Алімпіядзе ўзброены канфлікт на Каўказе праігнаравалі. Заклік лідэра праваабарончай арганізацыі «Рэпарцёры бязь межаў» Рабэра Мэнара адхіліць ад удзелу ў спаборніцтвах Грузію й Расею не пачулі, як і заявы праваабаронцаў пра поўную адсутнасьць свабоды прэсы ў кітайскай сталіцы падчас гульняў. За межамі Кітаю многія сайты ды блогі з замілаваньнем паведамлялі, як расейская ўладальніца «срэбра» ў стралянiне зь пісталету абдымалася з бронзавай прызёркай, сваёй сяброўкай з Грузіі.

На цырымоніі адкрыцьця прысутнічаў прэзыдэнт Францыі Нікаля Сарказі, які яшчэ ўвесну, адразу пасьля крывавай расправы кітайскіх войскаў над удзельнікамі паўстаньня ў Лхасе, прыхільна ставіўся да ідэі байкоту Алімпійскіх гульняў. Але варта было кітайцам у красавіку абвясьціць байкот… Carrefour, францускай сетцы супэрмаркетаў, Сарказі хуценька зьмяніў свае меркаваньне. Джордж Буш таксама не прыслухаўся да парады кандыдата ў прэзыдэнты ЗША рэспубліканца Маккейна ня ехаць у Пэкін на Алімпіяду.

Палова кіраўнікоў краінаў «вялікай восемкі» не ўшанавалі сваёй прысутнасьцю яе адкрыцьцё. Гэта канцлерка Нямеччыны Ангела Мэркель (яна была на той момант у адпачынку), прэм'ер-міністар Канады Стывэн Гарпэр і прэм'ер-міністар Вялікай Брытаніі Гордан Браўн. Але ж на закрыцьцё ён прыехаў — усё-ткі наступная




Алімпіяда будзе ў Лёндане. Цікавае тлумачэньне сваёй адсутнасьці ў Пэкіне даў італьянскі прэмьер Сільвіё Бэрлюсконі. Паводле ягоных словаў, прычынаю сталася… надвор'е ў кітайскай сталіцы — 30 градусаў гарачыні, высокая вільготнасьць. Такое надвор'е ў Італіі ўлетку, відаць, рэдка назіраецца.

Вельмі хутка мы пабачылі Ангелу Мэркель і Нікаля Сарказі ў ролі міратворцаў — гэтае слова ў дадзеным выпадку можна ўжыць без усялякай іроніі. Менавіта Сарказі першым прапанаваў тыя шэсьць пунктаў мірнага пляну, які ляжа ў аснову пагадненьня аб разьвязаньні канфлікту, што падпішуць праз пасярэдніка Мядзьведзеў і Саакашвілі. Але не забудзе, відаць, міжнародная супольнасьць і кадры, на якіх Сарказі, адказваючы ў Маскве на пытаньне карэспандэнткі францускай Liberation пра адсутнасьць у пляне гарантыяў тэрытарыяльнай цэласнасьці Грузіі, круціўся, бы вужака на патэльні, спрабуючы давесьці, што гэтая саступка расейскаму боку ня ёсьць праявай слабасьці й баязьлівасьці.

### Калі гавораць гарматы, МАК маўчыць

Насамрэч, усе заходнія лідэры ў сярэдзіне жніўня перажылі сапраўдны шок. Яны не чакалі нагэтульки агрэсіўных дзеяньняў з боку Масквы і ня ведалі, што можна ім супрацьпаставіць, чым гэтыя дзеяньні паграджацьмуць сьвету. У параўнаньні з Расеяй Кітай выглядаў на той момант у вачах Захаду параўнальна міралюбнай, прынамсі, прадказальнай дзяржавай, дзе максымальная пагроза для заходняй дэмакратыі — гэта затрыманьне некалькіх заходніх турыстаў падчас акцыяў салідарнасьці з Тыбэтам. На тле бесцырымоннага затрыманьня, напрыклад, афіцыйнага прадстаўніка АБСЭ ў Грузіі расейскімі міратворцамі, гэта былі ўсяго толькі нязначныя эксцэсы…

Падзеі ў Грузіі, апрача іншага, канчаткова разьвеялі міф пра тое, што падчас Алімпіядаў у сьвеце уладараць мір і спакой. Хоць прыкладаў таго, што гэта ня так, хапала і раней.

> Варта было кітайцам у красавіку абвясьціць байкот… Carrefour, францускай сетцы супэрмаркетаў, Сарказі хуценька зьмяніў свае меркаваньне.

Алімпіяда ў Бэрліне, 1936 год. Нямецкія войскі ўжо даўно ўвайшлі, насуперак Вэрсальскай мірнай домове, у «Рэйнскую дэмілітарызаваную зону», ужо ні для кога не сакрэт, што стаіць за расісцкімі прамовамі фюрэра і ягонымі заявамі пра ўставаньне нямецкага народу з каленяў. Тым ня менш, Алімпіяда ператвараецца для гітлерскай Нямеччыны ў трыюмф волі, увасоблены ў аднайменным фільме Лені Рыфэншталь.

1952 год, Хэльсынкі. Халодная вайна ў разгары. Параза футбольнай зборнай Савецкага Саюзу на Алімпіядзе з буйным лікам ад «рэвізіянісцкай» Югаславіі ледзь ня скончылася для савецкіх футбалістаў рэпрэсіямі.

1956 год, Мэльбурн. Уварваньне савецкіх войскаў у Вугоршчыну ў траўні, здушэньне нацыянальна-вызвольнага паўстаньня ў Будапэшце не перашкодзіла гасьціннаму прыёму савецкіх алімпійцаў увосені ў Аўстраліі.

1968 год, Мэхіка. Уварваньне войскаў Арганізацыі Варшаўскага пакту на чале з СССР у Чэхаславаччыну ніяк не паўплывала на Алімпіяду ў сталіцы Мэксыкі.

1972 год, Мюнхэн. Палестынскія тэрарысты ўчыняюць крывавую бойню, расстраляўшы 11 ізраільскіх спартоўцаў, захопленых у закладнікі. МАК абвяшчае… перапынак на адзін дзень. Гульні пакінулі толькі ізраільскія спартоўцы ды частка амэрыканскай каманды (у тым ліку папярэднік Майкла Фэлпса, тагачасны шматразовы чэмпіён у плаваньні Марк Сьпітц), а яшчэ галяндцы, а таксама некаторыя арабскія дэлегацыі — зь меркаваньняў бясьпекі.

1980 год, Масква. Байкот Алімпіяды з прычыны вайны ў Аўганістане, арганізаваны Захадам, ня меў чаканага плёну. У Маскву прыехалі ня толькі каманды сацлягеру (за выключэньнем КНР), але ў прыватным парадку і спартоўцы некаторых заходніх краінаў, у тым ліку ЗША. У выніку СССР «зааваяў» 80 залатых мэдалёў. Гэты рэкорд не ўдалося паўтарыць нават на Алімпіядзе ў Пэкіне, дзе кітайцам давялося задаволіцца «ўсяго» 51 залатым мэдалём.

1984 год, Лос-Анджэлес. Алімпіяду на загад Масквы байкатуюць сацыялістычныя краіны, за выключэньнем Румыніі і Кітаю. У Эўропе тым часам разьмяшчаюцца амэрыканскія «Пэршынгі».

1992 год. Барсэлёна. Армяна-азэрбайджанскі канфлікт, узброеныя канфлікты ў Грузіі і Малдове, грамадзянская вайна ў Югаславіі — усё гэта МАК не палічыў падставаю для адмены Алімпійскіх гульняў.

### Залатая ліхаманка

Безумоўна прыемна, што беларускія спартоўцы заваявалі 19 мэдалёў, зь якіх 4 — залатыя. Тым больш прыемна, што большую палову іх заваявалі атлеты і барцы (барацьба ў старажытнай Грэцыі існавала яшчэ задоўга да пачатку першых Алімпійскіх гульняў). Пра гісторыю вясьлярства на байдарках і каноэ «Наша Ніва» пісала.

Пры ўсёй павазе да іншых алімпійскіх дысцыплінаў, у тым ліку тэхнічных, ня кожны заўзятар, напэўна, добра разьбіраецца ў новаўвядзеньнях. Што такое ВМХ, напрыклад? ВМХ — гэта ровары зь нізкай рамай і калёсамі без пераключальнікаў хуткасьці. Спаборніцтвы з выкарыстаньнем такіх ровараў упершыню былі ўлучаныя ў праграму Алімпійскіх гульняў. У выніку першы ў гісторыі залаты алімпійскі мэдаль у гэтай дысцыпліне сярод мужчынаў заваяваў прадстаўнік Латвіі. І застаўся адзіным яе залатым мэдалём у Пэкіне.

З аднаго боку, павелічэньне колькасьці дысцыплінаў і адпаведна — мэдалёў — з кожнай новай Алімпіядай дае шанец на іх атрыманьне нават самым маленькім краінам: такім, як Багамскія выспы, напрыклад, ці Маўрыкій. З другога боку, перамогі вялікага спрынтэра зь Ямайкі Усэйна Болта ды іншых ямайскіх бегуноў ня могуць схаваць той факт, што большасьць ямайскіх, багамскіх і іншых спартоўцаў жывуць і трэніруюцца ў ЗША.

Спорт, у тым ліку алімпійскі, даўно зрабіўся магутнай прыбытковай індустрыяй, якая патрабуе ўсё новых дысцыплінаў. І лідуючыя пазыцыі ў спорце нязьменна займаюць найбольш індустрыяльна разьвітыя краіны.

Зь дзяржаваў G8 у першую дзясятку па мэдалях у Пэкіне ня трапіла толькі Канада, якая заняла 19-месца. Яе апярэдзіла, сярод іншых, Беларусь (16-е). А Вялікая Брытанія дасягнула самага значнага посьпеху ў сваёй спартовай гісторыі за апошнія 100 гадоў, прапусьціўшы наперад толькі Расею, ЗША і Кітай.

Ня варта верыць байкам пра тое, што з кітайскіх спартоўцаў зрабілі біяробатаў з дапамогай жалезнай дысцыпліны ды ўсходніх прэпаратаў, якія не пакідаюць сьлядоў у крыві, а то й геннай інжынэрыі. Хапіла, відаць, і стымулу ў выглядзе мільёна даляраў за чэмпіёнства. А ў тым, што ўсе арбітры падчас гульняў у Пэкіне пастаянна адчувалі на сабе прэсінг трыбунаў (а можа, і ня толькі трыбунаў) — сумнявацца не даводзіцца.

Удзельнік спаборніцтваў у грэка-рымскай барацьбе Ара Абрамян, які выступаў у Пэкіне пад сьцягам зборнай Швэцыі, на цырымоніі ўзнагароджаньня сарваў зь сябе бронзавы мэдаль і кінуў яго на дыван. Не, гэта ня быў пратэст супраць здушэньня Тыбэту ці вайны ў Грузіі.

Адзінай палітычнай акцыяй на Алімпіядзе можна лічыць тое, што сьцяг ЗША на заключнай цырымоніі несла грузінка.

Спартовец пратэставаў супраць неаб'ектыўнага рашэньня прысудзіць перамогу ягонаму італьянскаму спаборніку ў паўфінале. Між іншага, Міжнародны арбітражны суд, куды зьвярнуўся Абрамян, прызнаў рацыю спартоўца, а не алімпійскага камітэту. Магчыма, створаны прэцэдэнт? Прынамсі, гэта лепш, чым біць арбітра нагой у галаву, як зрабіў кубінскі таэквандыст.

Значна больш, чым неаб'ектыўнае судзейства і допінгавыя скандалы, засмучае тое, як Алімпійскія гульні ўсё больш страчваюць свой першапачатковы сэнс, усё больш ператвараюцца ў пампэзнае, безгустоўна-папсовае шоў. Ад мэгаламаніі — характэрнай, напрыклад, для Алімпіядаў у Бэрліне, Маскве, а цяпер і Пэкіне — патыхае афіцыйным пафасам і невыносным сумам.

Але няма чаго наракаць на арганізатараў спаборніцтваў. Спрактыкаванаму і крыху стомленаму ад відовішчаў сучаснаму гледачу, бадай, даўно няма розьніцы, што глядзець па тэлевізары — апошні блёкбастэр з кампутарнай графікай, цырымонію адкрыцьця й закрыцьця Алімпіяды (крыху падмалявану на кампутары, каб было прыгажэй), жаночы бокс, які нам абяцаюць паказаць на наступных Алімпійскіх гульнях, цяляньне ў талерачкі ці бамбаваньне сёлаў і гарадоў.

# Інтэрнэт
## як будпляцоўка нацыі

Віртуальная нацыя — ня менш сур'ёзная і моцная супольнасьць людзей, чым папяровыя ранейшыя формы. Піша **Сяргей Богдан**.

Сёньняшні культуркампф улады і яе савецкай культуры зь несавецкай нацыянальнай культурай нагадвае біблійнае паданьне пра пачвару Галіяфа, які самаўпэўнена зьбіраўся зьнішчыць малога Давыда. У адкрытым баі асілак Галіяф перамог бы. Так адміністрацыйная машына беларускай дзяржавы можа перамалоць адкрытых працаўнікоў сталінскай спадчыны.

Але ўрэшце Давыд пераможа Галіяфа. Бо застасуе розум, вынайдзе новую прыладу, пазьбегне традыцыйнага двубою, схітруе. Сёньня носьбіты несавецкай культуры вынаходзяць новыя прылады для барацьбы і працуюць у сфэрах, якія будуць вырашаць будучыню, тады як улады змагаюцца састарэлымі гвалтоўнымі мэтадамі і дзейнічаюць, як той Галіяф.

Драконаўскія законы пра мову і СМІ нашкодзяць нацыянальнаму руху, але яго ня спыняць. Незалежная супольнасьць засвойвае сфэры, якія не паддадуцца дзяржрэгуляваньню ўжо з тэхнічных прычынаў — перш за ўсё электронныя тэхналёгіі. Вырашальнае значэньне будзе мець заваяваньне інтэрнэт-прасторы, ключавой для разьвіцьця ў новую эпоху.

### Назад у Афрыку!

Цяперашняя палітыка беларускай дзяржавы пераводзіць краіну ў мадальнасьць існаваньня Трэцяга сьвету. Гісторык Мошэ Левін апісаў падобную зьяву «дэцывілізацыі» — цывілізацыйнага адкату ў першыя дзесяцігодзьдзі савецкай улады. Вядома, пад гэтай зьявай звычайна маюцца на ўвазе больш экстрэмальныя праявы, чым у сёньняшняй Беларусі — прыкладамі дэцывілізацыі француcкі дасьледнік Нікаля Вэрт называе людаедзтва ў ГУЛАГу і выкарыстаньне бяросты яго адміністрацыяй — але ідэя тая самая — чалавецтва можа разьвівацца ва ўсіх кірунках, у тым ліку і назад.

БССР-РБ была квазі-дзяржавай Другога сьвету — зь яе ідэалягізаванай паказной прагрэсіўнасьцю і мадэрнасьцю ды прэтэнзіяй на стварэньне альтэрнатывы, *іншага* шляху.

Сёньняшнім беларускім уладам не да паказной прагрэсіўнасьці ці тварэньня нейкай альтэрнатывы для іншых. Супэрзадача сьціплая — утрымаць сытуацыю пад кантролем пэўнага кола асобаў. Няма завоблачных мэтаў, можна згарнуць задарагую інфраструктуру. Гэта — пэўны шлях у Трэці сьвет зь яго захаваньнем улады дзейнымі кіраўнікамі як адзіным прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі.

Зьмена мадальнасьці існаваньня беларускай дзяржавы — не такі абстрактны фэномэн, як можа падацца. Вымушана адышоўшы ад вялікіх праектаў (савецкай рэстаўрацыі, інтэграцыі з Расеяй), лукашэнкаўская дзяржава перажывае працэс спрашчэньня, зьніжэньня ўзроўню складанасьці арганізацыі.

Спрашчэньне арганізацыі не азначае скарачэньня дзяржаўнага кантролю ці распаду дзяржавы. Проста ва ўсіх сфэрах мае месца скарачэньне інстытуцыяў і праектаў, якія ня маюць істотнага значэньня і ўтрымліваць якія ўраду задорага. Многія зь іх былі запачаткаваныя яшчэ за савецкім часам ці ў эўфарыі першых гадоў незалежнасьці, ды былі пытаньнем прэстыжу. У прыватнасьці, дзяржава ідзе на скарачэньне акадэмічных інстытутаў, асабліва гуманітарных.

Асабліва паказальнымі ў гэтым сэнсе сталі зьмены ў сыстэме адукацыі, з выразнай тэндэнцыяй да рэдукцыі. Пры ўсіх запэўніваньнях у імкненьні да тэхналягічных вышыняў і інавацыі, дзяржава рэзка скараціла колькасьць навучальных гадзінаў і курсаў.

> Пакуль што digital gap — лічбавая фора, разрыў у выкарыстаньні электронных тэхналёгіяў — на карысьць альтэрнатыўнай беларушчыны.

Скарацілі праграмы ў ВНУ, а таксама тэрміны навучаньня ў іх, пры адначасовым ўмацаваньні кантролю над студэнтамі праз адсеў ня толькі пры паступленьні іх у магістратуру і асьпірантуру, але і праз сумоўі пры паступленьні ў ВНУ на важныя ў пляне кіраваньня дзяржавай спэцыяльнасьці. Пры тым найвышэйшыя асобы ўраду неаднаразова казалі пра празьмерную ўвагу да ўнівэрсытэтаў і недастатковую ўвагу да рабочых прафэсіяў, што ёсьць нонсэнсам ў кантэксьце імкненьня да «інавацыйнага разьвіцьця».

Рэдукцыя закранула і сярэднюю школу, якая адракл ася ад пляну пераходу на 12-гадовую адукацыю. Школа затое загрузае ў ідэалягізацыі. Мінадукацыі дазваляе дзейнічаць у навучальных установах арганізацыям, якія ў дэмакратычных дзяржавах былі б пад пільным наглядам органаў аховы канстытуцыйнага ладу, — як то казакі. Ідзе працэс дэградацыі школы савецкага тыпу ў школу, характэрную для аўтарытарных краінаў Трэцяга сьвету.

Сытуацыя ў сфэры камунікацыяў таксама больш выразна сьведчыць пра тэндэнцыі ў дзяржаўнай палітыцы, чым усе заявы пра стварэньне тэхнапаркаў. Пра перавагу прыватных інтарэсаў цяперашняга моманту над стратэгічнымі меркаваньнямі разьвіцьця дазваляе казаць, у прыватнасьці, неразьвітасьць доступу ў інтэрнэт, яго высокая цана — ці не найвышэйшая ў Эўропе. Яна тармозіць разьвіцьцё краіны, але дазваляе атрымліваць звышпрыбыткі манапалістам і дапамагае ў захаваньні ўлады.

### Стваральнае разбурэньне

Але ў тым, што адбываецца зь Беларусьсю, ёсьць і пазытыўны аспэкт. За гады бездзяржаўнасьці беларусы разьвілі фанатычнае дзяржаўніцтва. Дзяржава, а тым больш быццам бы незалежная, падавалася проста самамэтай, ідэалам. Пара зразумець, што дзяржава і нацыя ў Беларусі зусім розныя рэчы.

Што да нацыянальнай культуры, дык цяпер (у тым ліку пад ударамі новай палітыкі рэжыму Лукашэнкі) развальваецца магутная каляніяльная і савецкая спадчына, але тое, што рэжым прапануе наўзамен ім, ня мае пад сабой трывалай ідэйнай, матэрыяльнай і арганізацыйнай асновы (дастаткова параўнаць марксісцкі ВЛКСМ і цяперашні кліенталісцкі БРСМ).

Як вынік, нягледзячы на ўсю варожасьць рэжыму Лукашэнкі да праяваў несавецкае нацыянальнае культуры, разбурэньне савецкіх падмуркаў ды прапаганда крэольскага патрыятызму патэнцыйна ствярае новыя магчымасьці для несавецкае беларускае культуры.

### Інтэрнэт-нацыя

Упершыню ў гісторыі беларускай мовы склалася такая сытуацыя, што роля пісьмовае мовы большая, чым вуснай. Яна дыспрапарцыйная, але гэта сьведчыць пра разьвітасьць нацыі, хоць і аднабаковую. Белмова стала мовай, на якой перадусім чытаюць і пішуць, і толькі ў апошнюю чаргу размаўляюць. Таму ўнармаваньне пісьмовае мовы стала такім гарачым пытаньнем. Спробам навукоўцаў упарадкаваць клясычную тарашкевічаўскую норму рэжым супрацьпаставіў рэпрэсіўны закон аб правапісе.

Рэпрэсіўны закон у доўгатэрміновай пэрспэктыве — на карысьць тарашкевіцы. Правапісная рэформа прывядзе да дыскрэдытацыі афіцыйнага канону праз яго нестабільнасьць ды палітызаванасьць (чаго вартыя адныя правілы напісаньня вялікіх літараў!) і, адпаведна, непрактычнасьці. У той самы час падвысіцца і без таго значная роля неафіцыйнай белкультуры ў інтэрнэце і на ўсіх відах лічбавых носьбітаў, бо месца ў традыцыйных мэдыях ім не пакідаюць. Фактычна, закон выціскае тарашкевіцу і людзей, што карыстаюцца ёй, у сфэру высокіх тэхналёгіяў ды прымушае іх прайсьці мадэрнізацыю. Дзяржава ж вядзе цяпер барацьбу за «загадзя страчаны плацдарм», асуджаны гісторыяй на зьнікненьне сэктар культуры — папяровыя носьбіты і традыцыйныя інстытуцыі ды пісьменьнікаў. Яе кантроль над гэтым сэктарам ужо не вызначае будучыні культуры (хоць мо яшчэ і вызначае цяперашні яе дзень) і з кожным днём вызначацьме ўсё менш.

Калі прыхільнікі тарашкевіцы будуць дастаткова актыўнымі ў інтэрнэт-прасторы, дык больш пасіўныя суайчыньнікі трапяць на тэрыторыю, ужо дэмаркаваную прыхільнікамі несавецкай беларускай культуры і зь вялікай імавернасьцю зазнаюць прынамсі некаторы яе ўплыў. Выйграе той, хто прыйдзе першы і расставіць свае вешкі. Інтэрнэт становіцца будаўнічай пляцоўкай для будучага разьвіцьця нацыі. Пакуль што digital gap — лічбавая фора, разрыў у выкарыстаньні электронных тэхналёгіяў — на карысьць альтэрнатыўнай беларушчыны.

Яскравым прыкладам стала «Вікіпэдыя», дзе колькасьць артыкулаў у «афіцыйнай» вэрсіі нібыта і большая за тарашкевічную, але і аб'ём артыкулаў тарашкевіцай большы, і якасьць лепшая. Між тым менавіта даступнасьць усебаковай інфармацыі на белмове стане вырашальным чыньнікам у нацыянальным разьвіцьці. Таму мова «Вікіпэдыі» і Жывых часопісаў ня менш важная за мову «Беларускай энцыклапэдыі» і «Звязды».

Ня трэба сьцябацца зь «віртуальнасьці» і «інтэрнэтнасьці» нашае нацыі. Гэта новая прастора камунікацыі, прастора будучыні. Як некалі супольнасьці Старажытнасьці камунікавалі на форумах і вечах, мы сёньня зносімся ў нэце. Віртуальнасьць — гэта дадатная рыса ў гэтай характарыстыцы. З газэтаў, радыё ды ТБ таксама спачатку кпілі і лічылі іх несур'ёзнымі сродкамі. Віртуальная нацыя — ня менш сур'ёзная і моцная супольнасьць людзей, чым папяровая, звыклыя нам формы яе.

### Воля да жыцьця

У канчатковым рахунку лёс нашае культуры залежыць ад надзвычай суб'ектыўных чыньнікаў, перш за ўсё таго, што можна назваць воляй да жыцьця, настойлівасьцю. Ад таго, ці мы гатовыя трымацца свайго. Цяперашнія абмеркаваньні пераходу на афіцыйны правапіс трывожаць — замест таго, каб трымацца свайго і пратэставаць супраць гвалту (шукаючы, вядома, шляхоў выжываньня), усё часьцей гавораць пра «яднаньне» і «дыялёг».

**Працяг на старонцы 10.**



DARIUSS.LIVEJOURNAL.COM

**Лёс беларускай культуры вызначаць ня гэтыя людзі. На фота: Старадаўнія Гальшаны.**

# Ад Горадні да Ябланова



Юлія Дарашкевіч

Дзёньнік аднага падарожжа. Піша **Альбіна Семянчук**.

Сустракаю на вакзале ў Горадні групу студэнтаў-этнолягаў Ягелёнскага ўнівэрсытэту, якія наважыліся прыехаць у Беларусь пад уплывам праслуханых у alma mater лекцый аб матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Студэнты крыху незвычайныя: старэйшаму 49 гадоў, малодшай — 25. Яны атрымліваюць хто другую, а хто і трэцюю вышэйшую адукацыю. Плацяць за гэта з уласнай кішэні, прыехалі таксама за свае грошы.

Цяпер у Польшчы вельмі папулярны кірунак — этналёгія і культурная антрапалёгія. Мінулі часы, калі ён вабіў студэнтаў дзеля падарожжаў у экзатычныя краіны. Нядаўна адна студэнтка-этноляг тлумачыла мне, што не баіцца застацца бяз працы. У сябе на Падляшшы яна хацела б рэалізоўваць культурніцкія і навуковыя праекты, зьвязаныя з дасьледаваньнямі, якія аплачвае ЭС. Эўропа зь цікавасьцю адкрывае для сябе куткі, раней занядбаныя, а сёньня такія прывабныя і папулярныя.

Горадня вельмі падабаецца палякам. Польскія этнолягі ўсьведамлялі, што прыехалі ня ў «старэ польске място», а ў горад з мультыкультурнымі традыцыямі, які ўзьнік тысячу гадоў таму як цэнтар славянскай калянізацыі пасярод балцкай стыхіі. Давялося тлумачыць і пра архаічную балта-славянскую моўную супольнасьць, дзякуючы якой назва гораду — Гарадзен—Grodno—Gardinas — у суседніх народаў азначае тое ж самае. І пра Нямецкі рынак і нямецкую кірху ў цэнтры гораду.

Былі мы і на беларускай імшы ў Катэдры. Студэнтаў уразіла падабенства нашых моваў. Каторы ўжо раз тлумачыла, чаму на вуліцах не пачуеш беларускага слова. Зайшлі ў сынагогу і нечакана пабачылі велічны рэнэсансава-барочны інтэр’ер. Яе вонкавы псэўдарускі стыль не адпавядае ўнутранаму зьместу: гэткая энігматычная скрыначка. Калі б яе завесьці, якую яшчэ дзіўную музыку давялося б нам пачуць?

Езьдзілі і на Аўгустоўскі канал, які кожны імкнецца наведаць, хто бывае ў Горадні. Важны ня сам канал (дзе, дарэчы, вельмі праблематычна паплаваць на караблі альбо паабедаць), а рэгіён, які пачынаецца адразу за рысай гораду, за рэчкай Ласасянкай. У XIX ст. тут пралягала мяжа з Каралеўствам Польскім, таму этнічна беларуская тэрыторыя трапіла ва ўмовы польскага дамінаваньня. Адзін з рэдкіх рэгіёнаў, дзе пасьля скасаваньня уніі ў 80-я XIX ст. вернікаў пераводзілі не ў праваслаўе, а ў каталіцтва. Уніяцкія цэрквы ў Пярстуні і Сапоцкіне сталіся касьцёламі. Тэрыторыі ўздоўж ажыўленага калісь шляху з Інфлянтаў і Караляўца ў Горадню ў савецкія часы сталі памежнай зонай, зьдзічэлі і заняпалі.

Пад Пецярбургам такое будавалі толькі для імпэратара. У нас жа шляхта ўзводзіла раскошныя палацавыя комплексы паўсюль — у Шчорсах, Ружанах, Косаве, Моладаве, Красках.

У зоне Аўгустоўскага каналу аказаліся такія каштоўныя помнікі архітэктуры і гісторыі, як палац Валовічаў у Сьвяцку, палац Гурскіх у Радзівілках. Палацы робяць вялізнае ўражаньне. Супрацоўнік Эрмітажу Алег Іянісян неяк заўважыў, што пад Пецярбургам падобныя шэдэўры маглі быць збудаваныя толькі для імпэратара. У нас жа шляхта ўзводзіла раскошныя палацавыя комплексы паўсюль — у Шчорсах, Ружанах, Косаве, Моладаве, Красках. Кансэрвацыя іх з наступнай рэстаўрацыяй — задача нумар адзін, калі мы сапраўды думаем аб разьвіцьці турызму ў краіне.

А пасьля нашая невялікая група выехала ў трохдзённае падарожжа па заходняй Беларусі: Масты—Дзярэчын—Сынкавічы—Жыровічы—Слонім—Навагрудак. У Дзярэчыне спыніліся толькі таму, што далей нас чакалі іншыя сапегаўскія мясьціны — Жыровічы, Слонім, Дзятлава, Ружаны. На жаль, нішто тут не нагадвае аб былой велічы, акрамя вялізнага абэліску, збудаванага ў гонар Канстытуцыі 3 траўня 1791 г.

Пакінуўшы ўбаку Зэльву, хутка дабраліся да Сынкавічаў. Ужо здалёк заўважылі незвычайны бляск. Аказалася, гэта званіца побач зь сярэднявечным храмам, завершаная бліскучым купалам-цыбулінай. Дысананс з гатычнай царквой проста шакуе! А ня так даўно мы радаваліся, што нарэшце ў Сынкавічах зьявіўся малады і энэргічны бацюшка, які ўзяўся за дасьледаваньне і аднаўленьне царквы. (Званіцу, дарэчы, паставілі коштам расейскай нафтавай кампаніі «Славнефть».)

Палякі былі ўражаныя эўрапейскім выглядам гатычнага шэдэўру. У другой палове XV — пачатку XVI ст. прыхільнікі ідэй Флярэнтыйскай уніі (сёньняшні экумэнічны рух) Солтаны, Хадкевічы, Сапегі ў сваіх уладаньнях узводзілі гатычныя сьвятыні. З дазволу папы Аляксандра VI Іван Сапега, напрыклад, пабудаваў царкву, дзе набажэнствы маглі адбывацца раз паводле ўсходняга, раз паводле заходняга абраду. Такія ж гатычныя цэрквы, як у Сынкавічах, Сапегі збудавалі ў Кодані пад Берасьцем, Хадкевічы — у Супрасьлі. У Мураванцы на Лідчыне паўстала яшчэ адна царква-крэпасьць. Улюбёны сярод нашых дойлідаў гатычны стыль надаваў непрыступны выгляд ня толькі касьцёлам, але і праваслаўным цэрквам па ўсім Вялікім Княстве.

На ўезьдзе ў Жыровічы ў душы нібыта пачынаюць гучаць званы. Людзей у абіцелі мала. Сымпатычны сэмінарыст праводзіць экскурсію па Богаяўленскім, Крыжаўзьдвіжанскім храмах, Усьпенскім саборы, абмінаючы ў сваім аповедзе супярэчлівыя гістарычныя падзеі, канцэнтруючы ўвагу на духоўным значэньні славутай абіцелі. Ня ведаю, чаму яна яшчэ ня лаўра. Ідзём на старую крыніцу і прымаем купель. Полькі, змовіўшы малітву, адважна занураюцца ў ледзяную ваду, чым прыводзяць у замяшаньне нашых цётачак, якія доўга ня могуць сабрацца з духам. Перажываем сапраўдны катарсіс і, ачышчаныя, выпраўляемся ў далейшы шлях.

Слонім. Гады савецкага бязладзьдзя зрабілі сваю справу: «сядзіба музаў» Міхала Казіміра Агінскага, зьведзеная да ўзроўню савецкага райцэнтру. Цяжка недасьведчанаму чалавеку растлумачыць, адкуль тут узяліся такія шыкоўныя касьцёлы і кляштары бэрнардынак, бэрнардынаў (сёньня праваслаўны Троіцкі сабор), велічная сынагога (дагэтуль у руіне).

Як і ў Горадні, самае пачэснае месца ў цэнтры займае савецкі танк, скіраваны дулам на ратушу. Такое ўражаньне, што гэта ён зьнёс традыцыйную вежу на ёй, а заадно герб і ўсе правы на самакіраваньне, нададзеныя Слоніму яшчэ ў 1532 г. Блішчыць мэталадахоўка і лідзкая «Лакокраска». А самыя прывабныя мясьціны — канал Агінскага, на якім у 20—30-я XX ст. не было месца ад каякаў і яхтаў; прадмесьце Альбярцін зь яго несамавітым палацава-паркавым комплексам Пуслоўскіх — пустуюць незапатрабаваныя.

У Слоніме і ваколіцах сёньня няма ніякай турыстычнай інфраструктуры (гэта тычыцца і Жыровічаў, куды зьяжджаюцца тысячы паломнікаў).

Далей едзем на Навагрудак. Колішні Слонімскі павет сканчаецца ў Дзятлаве, дзе мы аглядаем вытанчаны сапегаўскі шэдэўр — касьцёл Унебаўзяцьця Багародзіцы (1646 г.). Звонку абрысы баракальных вежаў дысануюць з сучаснымі шклопакетамі, а ўнутры раскошныя калёны з чорнага мармуру галяндзкай работы XVII ст. — з блакітнай алейнай фарбай. Мае спадарожнікі ўжо звыкліся з падобнымі недарэчнасьцямі, ім ужо ня трэба тлумачыць, што ў нас няма кансэрватара здабыткаў, і ніхто, у прынцыпе, ня сочыць за захаваньнем гістарычнага выгляду помнікаў.

Едзем у кірунку Навагрудку. Пачынаецца зусім іншы культурна-гістарычны рэгіён, цудоўна апісаны Янам Булгакам у «Краі дзіцячых гадоў». Сэрца трымціць у гэтых мясьцінах ад сустрэчы з Адамам Міцкевічам. Перш-наперш вырашылі выкупацца ў Сьвіцязі, а ўжо потым ехаць на начлег у Наваградак. Але пазьніцца не выпадае, бо сёстры ў кляштары назарэтанак, зь якімі мы дамовіліся аб начлегу, мусіць, кладуцца рана. Наведваем Чомбраў — прататып Сапліцова з «Пана Тадэвуша». Няма часу ехаць у госьці да Верашчакаў у Туганаві-




**Альбіна Семянчук**

**дацэнтка катэдры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму Гарадзенскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Янкі Купалы.**

чы, Несялоўскіх у Варончу ці ў Руту да Растоцкага. Але заўтра нас чакаюць музэі ў Наваградку і Завосьсі і ўсё, што зьвязана з Адамам, нам, напэўна, апавядуць дасьведчаныя экскурсаводы.

Сёстры-назарэтанкі, аказваецца, кладуцца позна, так што ў промнях заходзячага сонца пасьпяваем зрабіць прамэнад па Наваградку. Цішыня, водар кропу, кветак у прысадах — як быццам час спыніўся. У такі ж летні вечар Адам Міцкевіч любіў забірацца на Замкавую Гару і адтуль аглядаць прасторы. Ад захапленьня ў ягонай душы нараджаліся вершы… Аб адзінаццатай вечара брама кляштара замыкаецца, але манашкі яшчэ доўга сьпяваюць пад гітару сярод дрэваў і кветак у садзе. З раніцы мы чуем гэтыя сьпевы ўжо ў касьцёле. Акрамя сёстраў і нас, у храме яшчэ тры чалавекі. Дванаццаць сьвятых назарэтанак глядзяць з правай сьцяны алтара. Гэта іх 65 гадоў таму, 1 жніўня 1943 г., забілі фашысты. І гэта значна больш блізкая да нас гісторыя дадзенага касьцёла, чым хрост малога Адама альбо яшчэ больш старажытны шлюб Ягайлы і Зоф'і Гальшанскай. А ў бочнай капліцы стаяць шляхцічы Наваградзкага павету, трымаючы ў руках свае галовы, якія яны склалі ў Хоцінскай бітве з туркамі ў 1621 г. Такую вусьцішную памятную табліцу з барэльефам фундаваў адзіны ацалелы зь іх — Ян Рудаміна-Дусяцкі.

Музэй Міцкевіча ў Наваградку, думаю, найлепшы такога кшталту ў Беларусі. На пачатку 1990-х польская фірма Budimex пасьпела старанна аднавіць родныя пэнаты паэта. Сонечным летнім ранкам адчуваеш сябе ў гэтым доме госьцем сям'і Міцкевічаў. Каля адчыненага лямусу стары вострыць касу. Квітнеюць гартэнзіі. Выйдзеш на былую Рынкавую плошчу, і як на далоні — дамініканскі і францішканскі кляштары, Барысаглебская царква, на суседнім пагорку — замак. Лёгка ўяўляеш на месцы сёньняшняга ўнівэрмагу ратушу.

Ваколіцы Наваградку неаддзельныя ад яго гісторыі. У які бок ні паедзеш, паўсюль знакамітыя мясьціны, маёнткі, кляштары, замкі і палацы. Мы выбралі кірунак на Любчу. З гэтага моманту з майго языка не сыходзіць імя Радзівілаў. Любча была рэзыдэнцыяй біржанскай галіны роду. Кшыштаф Радзівіл сабраў у замку калекцыю зь 900 карцінаў, сярод якіх былі творы Люкаса Кранаха, Альбрэхта Дзюрэра, Клёда Калё. Пры двары працавалі Будны, Рысінскі, а кніжкі іхныя выдаваліся тут жа ў друкарні. У ціхім сонным мястэчку аб былой велічы нагадвае, хіба, уязная вежа і некалькіх пабудоваў на месцы замку.

Прыемнай неспадзяванкай для нас была асфальтавая дарога зь Любчы ў Шчорсы і далей, на Карэлічы. Раней дарога была гравійная. Мы ўзьнесьлі хвалу Богу і праграме адраджэньня сяла і пакаціліся ў бок Шчорсаў. Велічныя руіны фальварку, сажалкі, парк, царква пачатку XVIII ст. у мястэчку даюць уяўленьне аб тым, які культурны асяродак тут быў на мяжы XVIII—XIX стст. Яго абавязкова трэба адрадзіць! (Хоць бы пакасіць траву ў парку.)

Мы набліжаліся да кульмінацыйнага пункту нашага падарожжа — Мірскага замку. Канечне, ня цешыць якасьць сучаснай адбудовы. Шакавала і адсутнасьць цэлага корпусу ў Нясьвіскім палацы. Але я глядзела на сваіх спадарожнікаў, якім падабалася практычна ўсё, і вучылася мысьліць пазытыўна. Цяпер Верхні горад у Менску пачынае нагадваць Старувку ў Варшаве. Варшава і Менск — сталіцы, вельмі падобныя па колькасьці насельніцтва, па разьмяшчэньні, па гістарычным мінулым. Але ў Польшчы разьвіваецца не адна Варшава, а кожны горад і рэгіён. Спаборнічаюць Кракаў і Ўроцлаў — каму быць культурнай сталіцай краіны. Не застаюцца ў баку Гданьск і Познань. Спрыяюць гэтаму і культурніцкія праграмы Эўрасаюзу. Штогод іншы эўрапейскі горад вызначаецца як культурная сталіца. Калі задумацца, то і ў нашай Горадні ёсьць шанцы гадоў праз дзесяць атрымаць гэты ганаровы статус. Рэшта залежыць ад нас.

> І ў нашай Горадні ёсьць шанцы гадоў праз дзесяць атрымаць статус культурнай сталіцы Эўропы.

Кульмінацыйныя пункты нашай вандроўкі пакідаю без камэнтароў, бо Мір і Нясьвіж іх не патрабуюць. У Міры найбольш эфэктным робіцца ўжо ня сам замак, а мястэчка зь яго мультыкультурным мінулым. Чаго вартыя сынагога і хедэр! Робіць уражаньне на маіх палякаў імя Саламона Маймана. Царква з касьцёлам на процілеглых баках Рынкавага пляцу — звыклы для нас фэномэн местачковай культуры. А вось прысутнасьці цыганскага барона і ўвогуле табару мы не заўважылі. Зь Нясьвіжу едзем у Баранавічы: там у нас заплянаваны начлег у братоў-вэрбістаў. Вэрбісты — ад verbum — слова. Бо на пачатку было Слова. Вэрбісты выдаюць у сваім кляштары беларускамоўны часопіс «Дыялог». Іх два з паловай чалавекі (як кажа брат Карнэль), але яны ўтрымліваюць у ідэальным парадку вялізны асяродак, абслугоўваюць два касьцёлы, прымаюць паломнікаў і моляцца, каб быў падпісаны канкардат, і папа Бэнэдыкт XVI прыехаў у Беларусь.

Да ночы мы пасьпяваем яшчэ зьезьдзіць у Завосьсе, дзе нарадзіўся Адам Міцкевіч. Такім чынам, зь ягоным сьветлым вобразам наш дзень пачаўся, зь ім і скончаецца.

Раніца трэцяга дня падарожжа зноў выдалася сонечная і сьпякотная. Пад'яжджаючы да Косава, мы ўжо марылі, дзе б выкупацца. Прахалода драўлянага шляхецкага дамка на месцы маёнтку Мерачоўшчына, дзе нарадзіўся Тадэвуш Касьцюшка, прымусіла забыцца на сьпякоту. І зноў, як у Завосьсі, занурыцца ў драматычную атмасфэру канца XVIII ст. У параўнаньні зь мінулым годам тут пабольшала экспанатаў, утульнейшым стаў сам дом, а за ім зьявілася прывабная кавярня. Ціністая выспачка сярод сажалкі чакала наведвальнікаў. Масткі і альтанкі выглядалі маляўніча. А краявіды былі, мусіць, самыя прыгожыя за ўвесь час нашага падарожжа. Разгледзеўшыся навокал з пагорку, на якім узвышаецца палац Пуслоўскіх, разумееш, чаму ён тут быў узьведзены. Граф Вандалін Пуслоўскі збудаваў тут сваю рэзыдэнцыю ў сярэдзіне XIX ст., бо хацеў быць побач зь ценямі Тадэвуша Касьцюшкі і ягоных паплечнікаў. А грошай яму ставала, каб збудаваць восьмы цуд сьвету. Легенда гаворыць, што тут было 12 вежаў і 365 вокнаў, шкляная падлога, пад якой плавалі рыбкі, сьцены з рознакаляровага мармуру, музыка разносілася па 132 пакоях, калі хтосьці дакранаўся да сьцяны. Усё было ў гэтым палацы, акрамя шчасьця. Сын Пуслоўскага вымушаны быў прадаць палац за бесцань, і той адразу пачаў занепадаць. Яшчэ ў 30-я XX ст. польскія ўлады зьвезьлі адсюль усё, што заставалася каштоўнага. Завяршальны акорд разбурэньня наступіў у 1944 г., калі савецкія партызаны ўзарвалі гэтае шляхецкае гняздо. У такім напаўразбураным выглядзе яно і стаіць. Але ўжо варушацца ў ім мурашкі — студэнты Берасьцейскага ўнівэрсытэту. На чале з выкладчыкам археалёгіі Алесем Бажковым яны вядуць раскопкі і прапануюць нам за дзьве тысячы рублёў каскі і экскурсію па сутарэньнях.


Фальварак у Завосьсі.
АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

У Ружанах — colosseum. Веліч роду Сапегаў жывая ў Беларусі, між іншага, дзякуючы яму. Калясальнае збудаваньне ў малым мястэчку здольнае прыцягнуць калясальную масу турыстаў. Непадалёк цудоўны касьцёл XVII ст., а каля яго брацкая магіла нямецкіх жаўнераў з Другой сусьветнай вайны (таму, дарэчы, на аднаўленьне касьцёла давалі грошы немцы, а таксама княгіня Сапега). Насупраць касьцёла — рэдкі па прыгажосьці базылянскі кляштар XVII ст. з царквой у стылі барока. За ёй можна ўгледзець і вялізную сынагогу (як паўсюль, стаіць пустая). Пляніроўка мястэчка захавалася цудоўна. Каля палацу сустракаем берасьцейскіх рэстаўратараў, якія дзеляцца плянамі па аднаўленьні помніка. У праекце пакуль аднаўленьне афіцынаў, якія прымыкаюць да ўязной брамы. Рэстаўратары скардзяцца, што няма ў Беларусі фасоннай рэстаўрацыйнай цэглы. Як тады, кажу, можна пачынаць рэстаўрацыю? У архіўных крыніцах, якія датычацца будаўніцтва касьцёлаў альбо палацаў, заўсёды ўзгадваецца так званая fabrica, гэта значыць, цагельня, за якую адказваў асобны чалавек, дзе выраблялiся патрэбныя будаўнічыя матэрыялы. У Ружанскім палацы, напрыклад, калянада складзеная з цэглы, формаю як паўкола. Думаю, архітэктар Я.Бэкер адразу замовіў неабходную колькасьць такой паўкруглай цэглы на ўвесь комплекс. І ня мучыліся будаўнікі ў канцы XVIII ст. так, як бедныя савецкія ў 80-я XX ст., каб узьвесьці ідэальна круглую калёну з ідэальна прастакутнай цэглы, якая пры гэтым аказалася не маразаўстойлівай.


Рэшткі палацу ў Шчорсах.
АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

У берасьцейскіх рэстаўратараў шмат працы. У плянах, акрамя палацаў у Косаве і Ружане, аднаўленьне капліцы роду Ажэшкаў у Закозелі. А ў Горадні нават няма рэстаўрацыйных майстэрняў, таму нічога асаблівага і не плянуецца аднавіць, хоць помнікаў больш, чым у Берасьцейскай вобласьці. Адзін палац у Сьвяцку чаго варты. Едучы далей, мы пабачылі, як гібее цудоўны палацавы комплекс у Красках, аднак ці возьмуцца за яго рэстаўратары — невядома. Вось, каб кожны рэгіён меў у плянах аднаўленьне пэўных турыстычных аб'ектаў!


Савецкі танк у цэнтры Слоніму.
АЛЕСЬ МАТАФОНАЎ

Ружаны вабяць і цудоўным возерам зь ня менш цудоўнай назвай — Паперня (значыць, у XVI—XVII стст. тут выраблялася папера, на якой мог быць надрукаваны, напрыклад, наш Статут 1588 г.). Тут цяпер месьціцца дзіцячы санаторый, але ў пэрспэктыве маглі б узьнікнуць іншыя турыстычныя аб'екты. Якую асалоду мы адчулі, купаючыся ў чыстых водах сьпякотным полуднем! Не заўважылі, як пасьля гэтага даехалі да Красак, палюбаваліся цудоўным palazzo, якое воляю яго ўладальнікаў Сегеняў нібыта перанесенае сюды зь берагу Міжземнага мора. Літаральна праз тры кілямэтры наступны палац — у Падароску. Гаспадары — Чачоты і Бохвіцы — абнесьлі і яго, і парк вакол магутным мурам.

На зыходзе сьпякотнага дня мы заехалі ў Ябланова, якое ў XVIII ст. належала славутаму асьветніку і навукоўцу, наваградзкаму ваяводу Аляксандру Ябланоўскаму. Тут знаходзяцца руіны касьцёла, ідэнтычнага касьцёлу ў Воўчыне, дзе да нядаўняга часу спачывалі парэшткі апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Унікальная васьмігранная пабудова ў Ябланове, якая нагадвае аб масонскіх схільнасьцях яго ўладальніка, таксама як і яго каранаванага сябра, дагэтуль ня ўзятая пад ахову дзяржавы.

Большасьць убачаных намі помнікаў, якія калісьці былі асяродкамі культуры, цяпер знаходзяцца на пэрыфэрыі культурнага жыцьця краіны і могуць падзяліць лёс ябланоўскай сьвятыні. Дарэчы, на сучаснай трасе Горадня—Ваўкавыск—Берасьце праз кожныя пяць кілямэтраў сустракаюцца маёнткі, многія зь якіх нядрэнна захаваліся і ўяўляюць сапраўдныя пэрліны культуры і архітэктуры. Многія зьвязаныя з славутымі імёнамі, як, напрыклад, Лыскава, дзе пахаваны вялікі новалацінскі паэт Францішак Карпіньскі. Альбо Гнезна — мястэчка, дзе захаваўся і палацава-паркавы ансамбль, і гатычны касьцёл пачатку XVI ст. Былі мы і ў Воўпе, дзе ўнікальны драўляны касьцёл XVII ст. мае яшчэ больш унікальны алтар, зроблены нідэрляндзкімі майстрамі. Залочаная разьба па дрэве выдае руку геніяльнага скульптара. Калі ж ведаць, што ўладальнікамі Воўпы ў XVII ст. былі ўсё тыя ж усёмагутныя Сапегі, а ў касьцёле адбываліся соймікі шляхты Ваўкавыскага павету, а мястэчка важнае таксама і для габрэйскай культуры (захаваўся вялікі могільнік, але, на жаль, не захавалася сынагога), то не зьдзіўляесься, а толькі ганарысься вялікай гісторыяй і культурнай спадчынай нашага краю, сваёй прыналежнасьцю да гэтай культуры і гэтага народу.

# Інтэрнэт як будпляцоўка нацыі

Працяг са старонкі 7.

У нямецкім грамадзтве зь яго досьведам вызваленьня ад таталітарызму ў прынцыпе не дыскутуюць з аматарамі знайсьці апраўданьні для рэжыму Гітлера, адшукаць у дзеяньнях нацыстаў нейкую праўду. Бо ёсьць рэчы, якія мусяць быць проста асуджаныя, і дзеля гэтага ня варта ў тысячны раз перапраўджваць факты злачынстваў фюрэра. Вось гэтага часам бракуе беларусам, якія хочуць знайсьці праўду ў словах заведама фальшывых людзей. Самавольны дзяржаўны гвалт і парушэньні правоў мусяць быць адназначна асуджаныя, а не абмяркоўваныя на прадмет іх гіпатэтычнай рацыі і карысьці.

Асабліва гэтая загана небясьпечная ў спалучэньні зь нігілізмам і ўсеагульнай узаемаадасобленасьцю. Мы ўпарта не прызнаём сваіх навукоўцаў і творцаў за аўтарытэты! У выніку адзінымі аўтарытэтамі становяцца «дэпутаты Здановічы». Канчатковым жа арбітрам пры такім падыходзе робіцца дзяржава, бо паасобныя дзеячы нацыянальнай культуры не карыстаюцца павагай, а інстытуцыйнае разьвіцьцё ўстановаў нацыянальнай культуры застаецца слабым. Фактычна, мае месца нігілізм у дачыненьні ня толькі да творцаў, але і да здабыткаў беларускае культуры. У выніку ня складваецца агульнанацыянальнага кансэнсусу па культурніцкіх пытаньнях і ўвесь час адбываецца малаабгрунтаваная рэвізія нават фундамэнтальных прынцыпаў.

Чаму так? Бо згаданы вышэй працэс дэградацыі распаўсюджваецца ня толькі на ўрадавыя, але і на апазыцыйныя структуры. Мае месца рэгулярны рэгрэс узроўня складанасьці грамадзкай арганізацыі (згадайма прафсаюзы і няўрадавыя арганізацыі). Гэта выклікана ня толькі рэпрэсіямі, якія зьнішчалі старыя структуры і не дазвалялі паўстаць на іх месцу новым (як то ў выпадку СМІ). Гэта выклікана і аб'ектыўнымі ўмовамі сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне. Таму так істотныя любыя намаганьні нацыянальнага руху ў напрамку супольных, калектыўных дзеяньняў. На ўзроўні індывідуальных чынаў перамагчы немагчыма. І гаворка не пра мільённыя кампаніі і рэгістрацыю масавых партыяў. Ідзецца пра любую справу, якую мы робім не самотна. Хай гэта нават проста талака. Трымацца разам — закон нацыянальнай перамогі.

* * *

Ацэньваючы сучасную сытуацыю нацыянальнага руху варта зважаць ня толькі на раскладку сілаў у традыцыйных яе катэгорыях, але і на тэндэнцыі. Перш за ўсё на выкарыстаньне новых ідэяў, тэхналёгіяў і палёў для змаганьня — хто вае сілай, а хто розумам. Таму і пэрспэктывы белмовы, у прыватнасьці тарашкевіцы, трэба ацэньваць ня толькі ў сьвятле будучай адміністрацыйнай забароны.

### Ня трэба было рваць партрэты Пуціна?

**Дэмакраты моцна павярнулі на Захад.** Так, у Беларусі павінныя быць эўрапейскія каштоўнасьці, але трэба шукаць выхад і да Расеі. Апазыцыя можа разьлічваць на перамогу тады, калі Расея ня будзе супраць ізьнягa кіраваньня. Вялізная памылка была зроблена, калі Беларусь наведваў У.Пуцін. Дэмакраты рвалі партрэты расейскага прэзыдэнта, таптылі сьцягі на вулічнай акцыі. Не сумняюся, што гэтым момантам скарыстаўся А.Лукашэнка. Маўляў, фінансуй, а то вунь хто прыйдзе пасьля мяне. На гэтым рэжым трымаецца ўсё жыцьцё. Толькі калі апазыцыянэры перайграюць А.Лукашэнку ў лявіраваньні паміж Захадам і Усходам, тады яны адчыняць шлях да перамогі. Калі паглядзець на вынікі нядаўняга апытаньня, якое правёў НІСЭПД, то роўныя стасункі паміж Расеяй і Эўропай падтрымлівае большае частка апытаных.

**Зьміцер Ч., Капыльскі раён**

### А раптам прыйдзе касманаўт?

**Пажывеш у Беларусі, дык дзівіцца абы-чаму ня будзеш. Бо, як-то кажуць, тут «магчыма ўсё».** Так і ёсьць. Але ж той выпадак, што адбыўся ў нядзелю 24 жніўня, усё ж выклікаў зьдзіўленьне, бо ніколі дагэтуль такога яшчэ чуць не даводзілася.

Ужо трое сутак, як у доме №25, корпус 1 па Лагойскім тракце праблемы з вадою. Пасьля некалькіх тэлефанаваньняў у ЖЭС №8 і ЖЭА Савецкага раёну на працягу двух дзён урэшце зьявіўся падвыпілы сантэхнік (дык то як заўжды) і сказаў, што павэтра ў трубах — гэта «нармальна», а потым шчыра прызнаўся, што ня ведае, што рабіць, бо ён навучаўся не на сантэхніка, а на кухара... і пачаў глядзець плёмбы на лічыльніках вады. А на пытаньне «што ж ён тады тут робіць?» адказаў: «Трэба ж неяк грошы зарабляць». Відаць, то й кухар зь яго ніякі, калі пайшоў працаваць у ЖЭС сантэхнікам, бо попыт на кухараў пакуль што ёсьць, і зарабляць можна значна болей.

Вось такі цікавы адбыўся выпадак. Тэлефанаваць у ЖЭС болей не адважыўся: а што, калі замест майстра альбо інжынэра там працуе нейкі балерун ці касманаўт?

**P.S.** У той дзень пасьля чатырох гадзінаў гарачая вада зьнікла канчаткова...

**Юры Бондараў, Менск**

### Чуеш адно, бачыш другое

**Зь юнацтва прывучыла сябе цікавіцца палітычнымі падзеямі ў краіне. Вось ізноў ідуць выбары. Але якія?** Акрамя разавых паведамленьняў па тэлебачаньні пра дэмакратычнасьць нашых выбараў і іх адкрытасьць ды маленькай заметкі ў мясцовай газэце «Жыцьцё Палесся» пад загалоўкам «Адным абзацам» — вакол ніякіх прыкметаў кампаніі. Спыталася калегаў на прадпрыемстве. «Якія выбары?» — адмахнуліся яны.

У мясцовай газэце пішуць пра паседжаньні райвыканкаму, асабліва пра новага кіраўніка: з кім сустрэўся, аб чым гаварыў. Але найбольш пра жніво — дэталёва, зь лічбамі. Ці так важна гэта для майго жыцьця? Дый на жыцьцё грамадзтва ў цэлым наўрад паўплывае. А вось пра выбары ў газэце нічога за месяц не знайшла.

Зрэшты, што могуць тыя дэпутаты? Каго яны прадстаўляюць? Адмену льготаў вырашылі бяз нас. Кантрактную сыстэму таксама прынялі без уліку нашых меркаваньняў... Ад такога і мне захацелася махнуць рукою: «Якія выбары?». Толькі вось...

Перашкаджае адчуваньне чалавечай годнасьці ды ўнутраная супраціўленьня відавочнаму падману.

Бо як інакш можна назваць той факт, што ад кіраўніцтва краіны чуеш адно, а ў жыцьці бачыш другое. Слухаю пра барацьбу з карупцыяй і назіраю вакол усё большае нарастаньне «цікага» блату. Слухаю пра барацьбу зь бюракратызмам і чую ад знаёмых, як нарастае колькасьць пустых адпісак. Слухаю аб павелічэньні пэнсій і са шкадаваньнем назіраю за жыцьцём пэнсіянэраў, якія ня могуць набыць неабходных лекі і паўнавартасную ежу.

Сьпіс можна працягваць, ды спынюся на выбарах. Пераглядзела склад акруговай камісіі — прозьвішчы, якія ў горадзе на слыху. Людзі ўсе паважаныя, на пасадах, з заслугамі і аўтарытэтам. Ну ня пойдуць яны супраць саміх сябе, ня будуць супярэчыць рэкамэндацыям зьверху: ёсьць што губляць!

З 12 чалавек — адзін прадстаўнік апазыцыйнай Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Як быццам стрымана абяцаньне дапусьціць да ўдзелу ў працы выбарчых кампаній прадстаўнікоў АДС. Толькі вось усё кіраўніцтва акруговых камісіяў — адказныя работнікі райвыканкамаў. Адзін суправаджаць гэта як крок насустрач празрыстасьці і дэмакратычнасьці выбараў? Ці за час праведзеньня папярэдніх выбарчых кампаній досьвед у іх фальсыфікацыі настолькі высокі, што ня страшна па адным «нязгодным» уключыць у склад камісіі?

А ва ўчастковыя выбарчыя камісіі, там, дзе робіцца рэальны падлік галасоў, адважацца ўключыць па адным прадстаўніку апазыцыі? Не адважыліся. Вось тут і момант ісьціны...

Можна спрагназаваць, хто будзе абраны ў дэпутаты ў трох навакольных акругах: Палеская акруга — Канопліч, Мазырская — Арцюшэнка, Калінкавіцкая — Ціханская. Шкада, што нельга зрабіць стаўкі...

Дрэнна адчуваеш сябе ў ролі «сярэднестатыстычнага» чалавека, не па-чалавечаму. Сумна, калі здымаеш зь сябе пачуцьцё адказнасьці за свой лёс. Нельга быць адасобленым ад грамадзкіх і палітычных зьяваў у краіне, дзе ты жывеш і чакаць, хто і як цябе скарыстае. Ва ўсялякім выпадку, перастаць быць «сярэднестатыстычным» хацяб для экспэрымэнту, на момант выбараў, можна паспрабаваць. А раптам спадабаецца новы вобраз, у якім куды больш чалавечай годнасьці і карысьці.

**Зося Лявонава, Мазыр**

# Разгляду не падлягае

Эпісталярная драма.

**Савету Міністраў Рэспублікі Беларусі**

Да вас зьвяртаецца індывідуальны прадпрымальнік Міхась Булавацкі.

Адпаведна з пастановай Савету Міністраў «Аб вядзеньні юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі кнігі ўліку праверак (рэвізій)», мне як індывідуальнаму прадпрымальніку пастаўлена ў абавязак набыць такую кнігу. Як беларусу, які вядзе сваю дакумэнтацыю на роднай мове, мне хацелася б набыць гэтую кнігу на беларускай мове. Але мне патлумачылі, што СМ распрацаваў форму такой кнігі чамусьці толькі на расейскай мове. Дарэчы, такая ж праблема ўзьнікае і з кнігай заўваг і прапановаў, і з квітанцыямі, і з прыходнымі касавымі ордэрамі, і зь іншай дакумэнтацыяй.

Прашу выправіць гэтую ненармальнасьць, якая, дарэчы, парушае Канстытуцыю. (...)

**Міхась Булавацкі, прадпрымальнік**

**Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусі №7-1-8/391 ад 30.01.2008**

Паважаны Міхась Пятровіч!

Міністэрства па падатках і зборах на даручэньне Апарату Савету Міністраў Рэспублікі Беларусі разглядзела Ваш зварот ад 10.01.2008 па пытаньні набыцьця кнігі ўліку праверак (рэвізій) на беларускай мове і паведамляе наступнае.

(...)

Улічваючы, што дадзеную кнігу набываюць усе суб'екты гаспадараньня, у тым ліку з замежным удзелам, кнігі ўліку праверак (рэвізій), а таксама іншыя бухгальтарскія дакумэнты надрукаваныя ў адпаведнасьці з артыкулам 17 Канстытуцыі на адной зь дзяржаўных моваў (расейскай).

Калі Вы жадаеце набыць гэтую кнігу на беларускай мове, то Міністэрства можа задаволіць Вашую просьбу шляхам разьмяшчэньня адпаведнага заказу на друкаваньне кнігі, але гэта патрабуе дадатковых сродкаў.

**Намесьнік міністра В.Б.Каменка**

**Намесьніку міністра В.Б.Каменку на №7-1-8/391 ад 30.01.2008**

Паважаны Васіль Барысавіч!

Апошні абзац Вашага адказу пачынаецца словамі: «Калі Вы жадаеце набыць гэтую кнігу на беларускай мове...» Жадаю. І ня толькі гэтую кнігу. Яшчэ кнігу заўваг і прапановаў, бланкі квітанцый, прыходных ордэраў і іншую неабходную для маёй працы дакумэнтацыю. Усё на беларускай мове.

Ведаеце, мне пашчасьціла нарадзіцца ў краіне з назвай Беларусь. Усё беларускае для мяне роднае, мова асабліва. І я хацеў бы, каб гэтыя мае пачуцьці паважаліся маімі суайчыньнікамі, асабліва тымі, ад каго так ці інакш залежыць мая жыцьцядзейнасьць. (...) Вы павінны ведаць, што ў Беларусі яшчэ шмат людзей, каму гэтае беларускае баліць.

Канстытуцыя краіны, пра якую Вы ўспамінаеце, зацьвердзіла роўнасьць дзьвюх дзяржаўных моваў.

Артыкул 17 Канстытуцыі, на які Вы спасылаецеся, не дае ніякай перавагі якой-небудзь мове. (...)

Натуральна, што друкаваньне памянёнай дакумэнтацыі на беларускай мове «патрабуе дадатковых сродкаў», але спадзяюся, што Вы ня мелі на ўвазе, быццам гэтыя сродкі павінен шукаць я. (...)

А да таго часу, пакуль Міністэрства знойдзе сродкі і надрукуе патрэбную дакумэнтацыю на тытульнай мове нашай краіны, прашу дазволіць мне як часовую меру захавесьці самаробныя «Кнігу ўліку праверак (рэвізій)» і «Кнігу заўваг і прапановаў» адпаведна распрацаваным формам гэтых дакумэнтаў.(...)

Спадзяюся, што ў нас з Вамі знойдзецца паразуменьне.

**Міхась Булавацкі, прадпрымальнік**

**Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусі №7-1-8/707 от 13.02.2008**

Паважаны Міхась Пятровіч!

Міністэрства па падатках і зборах разглядзела Ваш зварот ад 05.02.2008 па пытаньні вядзеньня кнігі ўліку праверак (рэвізій) і кнігі заўваг і прапановаў на беларускай мове.

У мэтах выкананьня дзейнага заканадаўства Міністэрства лічыць магчымым задаволіць Вашую просьбу праз набыцьцё вышэй указаных кніг па зацьверджаных формах на расейскай мове, зрабіць пераклад зьместу на беларускую мову і ўчыніць адпаведныя запісы па тэксьце.

**Намесьнік міністра В.Б.Каменка**

**Намесьніку міністра В.Б.Каменку на №7-1-8/707 от 13.02.2008**

Паважаны Васіль Барысавіч!

Мы з Вамі перапісваемся на адной мове, а ўражаньне такое, нібыта на розных. І Вы ніяк ня хочаце мяне зразумець.

Я ня буду набываць кнігу ўліку праверак (рэвізій) і кнігу заўваг і прапановаў на расейскай мове.

А да таго часу, пакуль у мяне зьявіцца магчымасьць набыць іх на нашай роднай мове, ужо трэці раз прашу дазволіць мне завесьці тыя кнігі ў самаробным выглядзе з адпаведнымі запісамі і зарэгістраваць у раённай інспэкцыі Вашага Міністэрства.

Пры гэтым ніякага заканадаўства парушана ня будзе. Бо тое, што выдае тое ці іншае Міністэрства ці нават Савет Міністраў, законамі не зьяўляецца. Законы прымаюць абраныя народам дэпутаты, а не міністры. Неяк дзіўна, што мне даводзіцца гэта тлумачыць намесьніку міністра.

Гаворка ідзе пра тое, што нейкі дакумэнт, выдадзены Вашым Міністэрствам, ня цалкам адпавядае Канстытуцыі нашай краіны. Менавіта гэта і выклікае ў мяне патрэбу зьвярнуцца да Міністэрства з вышэйзгаданай просьбай.

Спадзяюся, што чацьверты раз мне не давядзецца турбаваць Вас.

З добрымі пажаданьнямі

**Міхась Булавацкі, індывідуальны прадпрымальнік**

**Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусі №7-1-8/985 ад 27.02.2008**

Уважаемый Михаил Петрович!

Министерство по налогам и сборам сообщает, что Ваше обращение от 19 февраля 2008 года не подлежит рассмотрению.

(...)

В связи с тем, что в Вашем обращении не приводятся новые доводы или вновь открывшиеся обстоятельства, в соответствии со статьей 12 Закона Республики Беларусь «Об обращениях граждан», обращение от 19.02.2008 является необоснованным и рассмотрению не подлежит.

Переписка с Вами по данному вопросу прекращается.

**Заместитель Министра В.Б.Каменка**

Паколькі набываць кнігу па-расейску я не зьбіраюся, мяне могуць аштрафаваць. І наплявалі ім на недарэчнасьць «закону», пры якім беларускамоўны прадпрымальнік павінен мець па дзьве кнігі праверак і па дзьве кнігі заўваг і прапановаў, а расейскамоўны — па адной. Аштрафуюць раз, аштрафуюць другі — і нарэшце я, стары ўжо чалавек, здамся: навошта мне тыя турботы. І нашая незалежнасьць на адну адзінку паменее. Але гэтага і хочуць тая чыноўнікі. Таму ня здамся!

**Міхась Булавацкі, Магілёў**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Дарыюш Жукоўскі: «Зарабляю грошы, а на галерэю іх выдаткоўваю»

Мастацкая галерэя «Зоя» знаходзіцца ў цэнтры Варшавы, на вуліцы Капэрніка. Тут бесьперапынна ладзяцца выставы найцікавейшых беларускіх мастакоў. Я завітала сюды, каб пагутарыць з уладальнікам галерэі спадаром **Дарыюшам Жукоўскім** пра тое, як пачуваецца ў Польшчы галерыст, які зрабіў стаўку на прэзэнтацыю беларускага мастацтва. Спадар Дарыюш вельмі заняты, пасьпяховы і вясёлы чалавек. І любімае ягонае слоўца: «Спакойна, спакойна!», мусіць, сугучнае з жыцьцёвым дэвізам.


ПАЛІНА БАБІНА

**«НН»: Пан Дарыюш, ці можам гаварыць па-беларуску?**

**Дарыюш Жукоўскі:** Спакойна, спакойна. Я троху гавару пабеларуску.

**«НН»: Вашая галерэя працуе два гады. Вы і раней займаліся галерэйным бізнэсам?**

**ДЖ:** Раней займаўся беларускай музыкай. Прадусаваў музыкаў.

**«НН»: Адкуль такая цікавасьць да Беларусі?**

**ДЖ:** Ну, адкуль? Я зь Беласточчыны, з Гарадку.

**«НН»: Лічыце сябе беларусам?**

**ДЖ:** Так-так.

**«НН»: Дык Вы наш чалавек у Варшаве?**

**ДЖ:** Так ест!

**«НН»: Раскажыце, як зьявілася ідэя адкрыць галерэю «Зоя»?**

**ДЖ:** Калі я пазнаёміўся зь беларускімі музыкамі, а потым з мастакамі, я пабачыў, што ў Беларусі ёсьць цікавае мастацтва, якога тут, у Польшчы, зусім ня ведаюць. Вырашыў, што варта паказаць яго варшавянам і наогул палякам. А называецца галерэя «Зоя» ў гонар мастачкі Зоі Луцэвіч, якая са мной супрацоўнічае і падкідае творчыя ідэі. «Зоя» па-грэцку азначае «жыцьцё», і мы імкнемся паказаць жыцьцё, паказаць чалавека ў ягоных розных праявах. Варшава пасярэдзіне між Менскам і Бэрлінам, але ўсе палякі глядзяць на захад, а на ўсход не глядзяць. Захацелася іх троху павярнуць да беларускага мастацтва.

**«НН»: І як Вам гэта ўдаецца?**

**ДЖ:** Цяжка! То значыць, я яшчэ раблю іншую работу, зарабляю грошы, а на галерэю іх толькі выдаткоўваю. І зарабляць на галерэю трэба многа.

**«НН»: Не сакрэт, дзе Вы зарабляеце грошы?**

**ДЖ:** Не сакрэт. Я маю фірму, якая займаецца азеляненьнем Варшавы. Такая работа ў мяне. Добрая работа! Думаю, зь цягам часу галерэя таксама стане бізнэсам, але пакуль цяжка ідзе.

**«НН»: Тым ня менш, Вы два гады займаліся галерэяй і не расчараваліся ў сваёй ідэі?**

**ДЖ:** Яшчэ не! Не паддаюся, не стаміўся *(сьмяецца)*.

**«НН»: Ці вялікая Вашая фірма?**

**ДЖ:** Вялікая, 400 чалавек работнікаў.

**«НН»: Ого!**

**ДЖ:** Спакойна, спакойна. Звычайнае прыватнае польскае прадпрыемства.

**«НН»: Варшава такая дагледжаная і прыгожая. Тут столькі прыгожых і нават нечаканых расьлінаў.**

**ДЖ:** Прыемна чуць. Гэта і нашая работа. Вялікія паркі, скверы азеляняем, зімой ачышчэньне ад лёду, сьнегу — гэта нашая праца. Я паводле адукацыі лясьнік, скончыў школу лесьнікоў.

**«НН»: Ці сям’я ня супраць таго, каб Вы трацілі грошы на галерэю? Жонка ня супраць?**

**ДЖ:** Трошкі супраць. Але спакойна, спакойна. Яна з-пад Любліна. Мы зь ёй езьдзім да нас у Гарадок, вось былі на апошніх «Басах».

**«НН»: Ці спадабалася «Басовішча»?**

**ДЖ:** Не. Не хапала энэргіі, ідэі, як на мяне. Драйву не хапала, які я адчуваў там раней.

**«НН»: Як Вы знаходзіце тых, каго выставіць у галерэі?**

**ДЖ:** Праз знаёмых і знаёмых знаёмых. Адзін расказаў другому, другі трэцяму — так і знаходзім.

**«НН»: Паводле якіх крытэраў іх адбіраеце? Як вырашаеце, што вось гэтага мастака мы пакажам, а таго — не.**

**ДЖ:** Мы не выстаўляем такіх мастакоў, якіх можна паглядзець у Старым Мясьце, можна так сказаць. Такіх натурыстаў, камэрцыйных. Мы хацелі б паказаць такую... як тут слова падабраць... такую вспулчэсну штуку...

**«НН»: Сучаснае мастацтва. Авангарднае.**

**ДЖ:** О! Так, так.

**«НН»: Ці кантактуеце Вы зь беларускім пасольствам у Варшаве?**

**ДЖ:** Не. Здаецца, у нас розныя мастацкія густы (*сьмяецца*). Але мы адкрытыя і зацікаўленыя ў супрацоўніцтве.

**«НН»: Палякі ўвогуле адкрытыя для ўспрыманьня розных культураў?**

**ДЖ:** Больш закрытыя. 60 на 40. А трэба было б 40 на 60 (*сьмяецца*). Чым больш адкрыты, тым лягчэй жыць.

**«НН»: А ці беларусы закрытыя?**

**ДЖ:** Так, яшчэ больш закрытыя. І яны ня ведаюць, куды глядзець, з каго браць прыклад.

**«НН»: Ці часта ў Вас набываюць карціны?**

**ДЖ.:** Рэдка, але бывае такое.

**«НН»: Ці дорага купляюць?**

**ДЖ:** Нядорага. Карціны добрыя, але каштуюць танна (*сьмяецца*). На жаль, пакуль пакупнікі рэдкія. Прычым самім беларусам, якія жывуць у Варшаве, беларускае мастацтва патрэбнае яшчэ менш, чым палякам (*сьмяецца*).

**«НН»: Дык каму тады яно патрэбнае?**

**ДЖ:** Можа, самім мастакам. Можа, такім людзям, як мы з вамі. Можа, спачатку мала каму, а потым стане больш каму патрэбнае. Каб так адразу ўсё выйшла, не бывае. Як там кажуць? Кропля камень точыць.

**«НН»: У Вашай галерэі выстаўляюцца ня толькі беларусы?**

**ДЖ:** Ня толькі. І палякі, і немцы, і румыны. Але беларусаў, бадай, найбольш. Я б хацеў, каб як мага больш іх было.

**«НН»: Чым адрозьніваюцца беларускія мастакі? Ці мастацтва ўнівэрсальнае?**

**ДЖ:** Мастацтва ўнівэрсальнае. Але беларускія мастакі цікавейшыя за многіх іншых. Агульны ўзровень іх высокі.

**«НН»: Хто Вам падабаецца зь беларускіх мастакоў?**

**ДЖ:** Лёнік Тарасевіч, Артур Клінаў, Вова Цэсьлер. Яны падабаюцца мне і як людзі, ня толькі як мастакі.

**«НН»: Артур Клінаў яшчэ і пісьменьнік.**

**ДЖ:** Так! Ягоную кнігу ў нас можна купіць.

**«НН»: Ці ведаеце беларускіх пісьменьнікаў?**

**ДЖ:** Троху чытаю па-беларуску. Але найбольш ведаю беларускую літаратуру праз паэзію, якую выкарыстоўвае ў сваіх песьнях Зьміцер Вайцюшкевіч.

**«НН»: Як Вы рэклямуеце сваю галерэю?**

**ДЖ:** Звычайна. Праз маркетынг нармальны. Праз газэты, радыё, тэлебачаньне. Вось мая памочніца, пані Анна, рыхтуе прэс-рэліз пра нашую наступную выставу. Анна, што там у нас будзе? Выстава беларускіх мастакоў Антаніны Слабодчыкавай і Міхаіла Гуліна «Графіці рацыянальнага развіцьця», потым будзе выстава амэрыканскага мастака, потым з Брусэлю прыедзе рухомая выстава беларускага плякату. Да слова, нам бы хацелася завязаць кантакты з галерэйшчыкамі зь Менску, каб разам рыхтаваць выставы і ўзаемавыгадна супрацоўнічаць.

**«НН»: Ці часта бываеце ў Менску?**

**ДЖ:** Тры разы быў.

**«НН»: Ці бачыце ў Менску Беларусь?**

**ДЖ:** Так.

**«НН»: У чым?**

**ДЖ:** У людзях.

**«НН»: Якія спрэс гавораць па-расейску...**

**ДЖ:** О! Так! Якім не патрэбнае мастацтва, а патрэбныя грошы, машына, ежа...

**«НН»: Дык Беларусь, паВашаму, такая?**

**ДЖ:** А па-Вашаму якая?

**«НН»: Я жыву ў іншым коле. Мая сябры, ведаеце, гавораць па-беларуску, хоць, канечне, ім таксама трэба ежа і машыны. Але насамрэч Беларусь такая парадаксальная краіна, што беларускасьць крыецца, можа, ня так у мове, як у нейкіх мэнтальных, культурніцкіх рэчах. І яна ўзрастае. Аднак, прыехаўшы ў Менск, Вы сапраўды можаце не пачуць беларускага слова. Беларускасьць разьвіваецца дзякуючы і такім людзям, як Вы.**

**ДЖ:** Але скажыце, колькі незалежных галерэй у Менску? Іх можна пералічыць па пальцах рукі. І гэтага мала на такі вялікі горад. Там папросту няма куды пайсьці... Ці вось яшчэ: Вы працуеце ў «Нашай Ніве». Які яе наклад? 2000. А колькі людзей у Беларусі? 10 мільёнаў. Дык што такое на такую колькасьць насельніцтва дзьве тысячы асобнікаў «НН»?

**«НН»: Дык Вы ж самі гаворыце: ня ўсё адразу, кропля камень точыць!** (*Сьмяемся*)

**ДЖ:** Спакойна, спакойна! Давайце мы тут у галерэі будзем прадаваць Вашую газэту. Той, хто хоча пазнаёміцца з газэтай, зможа зрабіць гэта тут. І кніжкі вашыя давайце сюды, будзем прадаваць. Не хачу, каб на Беларусь глядзелі праз Расею. Але мне здаецца, што самі беларусы ня ведаюць, як жыць.

**«НН»: А палякі ведаюць, як жыць?**

**ДЖ:** Думаю, ужо ведаюць.

**«НН»: Ведаеце, як жыць? Раскажыце.**

**ДЖ:** Спакойна, спакойна! Гэта ўжо філязофія! Гэта другім разам.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

# Басовішча–XVIII




Новая культура, 2008

Песьня «Грэх» магла б пайсьці ў народ.

Складанка зь песень удзельнікаў конкурсу і хэдлайнэраў леташняга фэсту ў Гарадку. Для тых цікаўных, хто хоча паслухаць «музыку маладой Беларусі» ў студыйным варыянце. Уласна адкрыцьцяў тут для абазнанага слухача няшмат. З маладых вылучаецца Weeping Twilight з надзвычай запамінальнай балядай «а-ля Воплі Відаплясава». Песьня «Грэх» магла б пайсьці ў народ, але гурт пасьля «Басовішча—XVIII» нідзе больш не паказаўся. Цікава, але сыравата слухаецца Indra, што паклалі на музыку пякучы верш Леры Сом, які пачынаецца са словаў «Калі жанчына разьнімае ногі…». Дыск адметны і некалькімі рарытэтамі — беластоцкая беларускамоўная каманда Rima прадстаўляе трэк «Калевала» (у Беларусі іхныя песьні выдаваліся апошні раз з гадоў сем таму), «Крамбамбуля» — сваё бачаньне гіта гурту «Ы.Ы.Ы» «Ўсё нармальна, мама», а «Палац» — зусім сьвежую сваю песьню «Хай месяц». Дзякуючы такой музычнай разнастайнасьці кожны слухач знойдзе тут, як мінімум, дзьве—тры «свае» песьні.

# Алесь Камоцкі. З бацькоўскай кружэлкі




Aist music, 2008, 2 CD

Зь «Пералётных птушак» Ісакоўскага і Блантэра зьнік «бераг турэцкі».

У прыхільнасьці да савецкай песеннай спадчыны Камоцкі ўжо быў заўважаны ў папярэднай працы «Дах», дзе-нідзе ў пройгрышах там «бродила одинокая гармонь»:). Тое, што зрабіў Камоцкі мусіла б зьявіцца яшчэ з гадоў дваццаць таму, але тады савецкія шлягеры сьпяваліся пераважна на мове арыгіналу, а нешматлікія беларускія пераклады не прыжываліся. Мала веры ў тое, што прыжывецца «Самотны гарманіст» ці «Клён стары» ў перакладзе Камоцкага. У гэтай працы закладзена іншае. Камоцкі не бяз посьпеху спрабуе выканаць звышзадачу, што стаіць перад сьпеваком, які бярэцца за выкананьне даўно вядомых песень . Ён пераасэнсоўвае «гарачую дзявятку» па-свойму, а некаторым песенькам надае беларускі кантэкст (зь «Пералётных птушак» Ісакоўскага і Блантэра зьнік «бераг турэцкі»: «А я на зямлі застаюся// Чакаць маразы і сьнягі// У роднай сваёй Беларусі,// Дзе кожны куток дарагі»). Нельга не адзначыць і ансамбль памагатых, што надаў беларускім вэрсіям савецкіх гітоў надзвычайную сакавітасьць — баян Шувалава, скрыпка Карапецяна, гітара Змушкі, Івановіча, Шырына, а яшчэ гучаць клявішы, мандаліна, домра, клярнэт, саксафон… Гэтыя песьні маглі б стаць «двойчы народнымі», калі б загучалі ў якім сэрыяле ці шоў, бо (пера)створаныя з душой.

Другую кружэлку з трэкамі караоке можна разглядаць, як цудоўны падарунак для бацькоў і бацькоў бацькоў, незалежна ад іхнага стаўленьня да савецкага мінулага.

# Л.О.М. — 3 — «Without…»




West Records, 2008

Без надрыву і прэтэнзіі.

Яўген Салдаценка з сваім праектам «Л.О.М.» з тых беларускіх артыстаў, якіх няма. Ён не належыць да пэўнай тусоўкі, яго не чакаюць ля пад'езду адданыя прыхільнікі, журналісты яго таксама не непакояць, на сольны канцэрт у вялікай залі ён нават не замахваецца да ажыятажу на ягоныя працы ў дыскарнях няма. Ён проста набраў сэсійных музыкаў, каб рэалізаваць свае ідэі, якія, мяркуючы па музыцы, выношваліся не адно дзесяцігодзьдзе. Салдаценка разам з заслужанымі ды проста выдатнымі артыстамі выконвае музыку, якую можна назваць сьціплай — засьпявана, як і зайграна, тут усё без надрыву і прэтэнзіі. Часам у гэтых песьнях чуецца лагоднасьць Dire Straits — такая прафэсійная і густоўная рок-музыка (Go-go, Far above the sky), месцамі праскоквае нешта карчомна-шансоннае, але зноў жа ў далікатнай манеры («Две тени лета»), ну і здараюцца зусім мяккія і бескрыўдныя папсовенькія рэчы пра «кропелькі дажджу» (дождж у «Without…» — вобраз цэнтральны). Яўгенаў шэпт пад гітару наўрад ці хоць каго моцна зацікавіць. Во Шадзько фактычна з гэтым жа складам музыкаў горла ірве і посьпех мае. Хоць і ня толькі ў горле тым справа…

# Гюнэш. Хабібі



НМК, 2008

Мо ёй ад Турцыі ці Азэрбайджану спрабаваць трапіць на «Эўравізію»?

Другі альбом сьпявачкі толькі пацьвярджае мэтазгоднасьць яе сыходу з «Крамбамбулі». Крыху штучна выглядалі яе сольныя нумары ў «крамбамбульным» рэпэртуары дый наагул вузкімі (ці занадта шырокімі?) былі для яе межы праекту Лявона Вольскага. Праект «Гюнэш» — гэта немудрагелістая танцавальная музыка з моцным арабскім прысмакам на рымфы беларускіх паэтаў-песеньнікаў (па-расейску) ды творы ўласнага сачыненьня (па-азэрбайджанску). Гюнэш хоча быць заўважнай і, у адрозьненьне ад большасьці іншых нашых поп-сьпявачак, здольная на гэта. Прынамсі, на яе сцэнічныя шоў глядзець ня сорамна, а пра большасьць песень з «Хабібі» ня хочацца казаць гідкасьці (акрамя нейкай зьмярцьвелай «Прощай»). Гэты альбом не ўкладаецца ў беларускую поп-канву. Мо сапраўды ёй ад Турцыі ці Азэрбайджану спрабаваць трапіць на «Эўравізію»? Тады на Гюнэш спакойна можна было б падвесіць цэтлік «азэрбайджанская Руслана» :). А на самай справе, сьпяваць бы ёй блюз з арабскім калярытам — слухаць было б сапраўды цікава.

# Сяргей Анцішын. Летний дождь



West Records, 2008

Музыка сэрца з доляю акадэмічнасьці.

Выхад на першы плян выдатнага музыкі, чыя гітара гучыць у 60 з 75% таго, што мы чуем на беларускіх «эфэмках» і яшчэ ў 50% нефармату:). У сваёй сольнай праграме Анцішын з паплечнікамі проста грае. Выйшла 11 п'есаў для гітары, басу, клявішных ды саксафона на самыя адцягнутыя тэмы. Музыкаў вабіць зорны сьвет ды палёты ў сьне, яны абыгрываюць плёскат марскіх хваляў ды шум дажджу. У кожнай кампазыцыі — асноўная ўвага гітарным сола і перагуканьням зь іншымі інструмэнтамі. Анцішын для поўнасьці адчуваньняў выкарыстоўвае як электрычны, так і акустычны гук. Пэўнасьць прыходзіць зь першага ж трэку «Перад дажджом», што выконвае ён музыку сэрца, хоць і з доляю акадэмічнасьці. «Летний дождь» анічым не выбітная праграма, дыскаў з падобнай музыкай сотні тысячаў. Тым ня менш — пабачыўшы гэты альбом, варта яго ўзяць у калекцыю. Можна слухаць у тыя хвіліны, калі ня хочацца чуць аніякіх словаў.

**Сяргей Будкін**

# Belarus Freedom — новая песьня «Ляпісаў»



У новым альбоме «Ляпісаў» ёсьць дзьве песьні па-беларуску: «Зорачкі» і «Belarus Freedom». Альбом яшчэ ня выйшаў, але песьні ўжо выконваюцца на канцэртах.

Новы дыск «Маніфэст», як і яго папярэднік «Капітал», быў запісаны ў Кіеве на студыі «211» пад началам украінскага саўндпрадусара Віталя Тэлезіна. Агулам у ім 12 песень.

У продажы ён мае зьявіцца ў кастрычніку.

Наступны канцэрт, на якім «Ляпісы» прасьпяваюць песьні з свайго альбому, у тым ліку нонканфармісцкія, адбудзецца ў Віцебску, у Летнім амфітэатры, 14 верасьня.

Пасьля гэтага група зьедзе ў працяглы тур па Расеі. Ён скончыцца 24 кастрычніка прэзэнтацыяй альбому ў Маскве, у клюбе «Б1 Maximum».

Білеты на віцебскі канцэрт можна набыць у сталіцы і горадзе над Дзьвіною.

Песьня «Belarus Freedom» чапляе. Вось яе тэкст:

Залаты гадзіньнік у чорнай вароны,
Хлопец дурны, як малпа з каронай.
Дзіўны алмаз, эўрапейскія мэты,
Жабы ды чэрці па кабінэтах.

Сэрца палае, далонь не дрыжыць
Ды паляўнічы дамоў бяжыць.
Пагоня побач —
Будзем жыць!

BELARUS FREEDOM!!!
BELARUS FREEDOM!!!
BELARUS FREEDOM!!!
BELORUSSIA LIBERTA

Бораў шалёны напіўшыся сэму
іш бін актывіст бээрэсэму
воцат на вочы ліеца з нябёс
гуляць у хакей наш казачны лёс!

Сэрца палае, далонь не дрыжыць
Ды паляўнічы дамоў бяжыць.
Пагоня побач —
Будзем жыць!

BELARUS FREEDOM!!!
BELARUS FREEDOM!!!
BELARUS FREEDOM!!!
BELORUSSIA LIBERTA

BELARUS FREEDOM!!!
BELARUS FREEDOM!!!
BELARUS FREEDOM!!!
BELORUSSIA LIBERTA

**МБ**

# У дарозе да сьвятыні

Піша Андрэй Павач.

Маладэчанскі краязнаўца і бібліяфіл Міхась Казлоўскі стварыў у родным горадзе цэлую творчую лябараторыю. Колькі дзясяткаў чалавек з усёй той часткі гістарычнай Віленшчыны, што засталася ў Беларусі, дапамагаюць яму рабіць ягоную шляхетную справу. Малююць, пішуць лірыку і празаічныя творы, зьбіраюць успаміны, займаюцца краязнаўствам… Як вынік — дванаццаць нумароў часопісу «Куфэрак Віленшчыны», без сумневу, найлепшага ў Беларусі краязнаўчага выданьня, больш за дзясятак кніжак бібліятэкі гэтага часопісу, вялікая падборка паштовак, прысьвечаных знакамітым беларусам, бясконцыя прэзэнтацыі і канфэрэнцыі. І ўсё гэта зь вялікім мастацкім густам, у прыгожым афармленьні, якога гэтак нестае сучаснай кніжнай культуры. Тое, што робіцца Міхасём Казлоўскім і ягонымі сябрамі, — даўно перарасло межы лякальнай зьявы. Па сутнасьці, гэта ці не найлепшы ў сучаснай Беларусі прыклад канкрэтнай культурнай справы, якую лепей ці горай, але можа рабіць безь якой падтрымкі любы чалавек, які стараецца не адмерваць сваё служэньне Радзіме прамежкамі паміж выбарчымі кампаніямі.

Мабыць, таму і вышуквае спадар Міхась для сваіх досьледаў падобных да сябе герояў — сваіх падвіленскіх землякоў і суродзічаў, людзей, вядомых усёй Беларусі ці невядомых амаль нікому, але аднолькава сумленных і, мабыць, зусім роўных перад нашчадкамі ў зробленай імі для Радзімы працы.

Такі герой новай кнігі Міхася Казлоўскага — шырока вядомы ў міжваеннай Вільні беларускі палітык, грамадзкі дзеяч і каапэратар Адольф Клімовіч, лідэр тагачаснай Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі. Адольф Клімовіч — адзін з тых шматлікіх у гісторыі Беларусі патрыётаў-актывістаў, якім даводзілася займацца адразу ўсім: выдаваць беларускі каапэратыўны часопіс, арганізоўваць дзейнасьць лякальных структураў БХД, накіроўваць ідэалягічную лінію сваёй партыі. І ўсё гэта ў пастаяннай грашовай нішчымніцы, праз паліцэйскі перасьлед і частае неразуменьне самых блізкіх людзей. І, безумоўна, не таму, што хацелася праявіць самыя разнастайныя свае таленты, а таму, што іншых працаўнікоў проста татальна не хапала. Чытаючы кнігу, я ўжо ня першы раз злавіў сябе на думцы — а нашто гэта ўсё было такім людзям патрэбна, быццам ня мелі дзе прыкласьці свае сілы. Чаму Адольф Клімовіч — інжынэр з эўрапейскай адукацыяй, не ўладкаваўся аконамам да якога пана пад Вільняй, жыў бы сабе спакойна ды бліскаў бы часам патрыятызмам, пішучы артыкулы ў якую апошнюю беларускую газэту? Ды і ў Празе можна было б застацца. Але памяняў усё гэта на сумнеўную пэрспэктыву актывіста маленькай партыі маленькага эўрапейскага народу, які ня быў гаспадаром нават на кавалку сваёй зямлі. Не адрокся ад свайго народу, не схаваўся ў цень, калі на ягонай зямлі сышліся ў сьмяротнай бойцы камуністычны да фашыстоўскі монстры. І ня ўцёк пасьля ў эміграцыю, хоць ведаў, што ягоная праца ў гады вайны — стопрацэнтны расстрэльны артыкул для бальшавікоў. Ужо вярнуўшыся зь лягеру Адольф Клімовіч працягваў сваё ўпорыстае служэньне беларускай справе, пісаў артыкулы па гісторыі і культуры, склаў велізарную картатэку знакамітых беларускіх дзеячаў, усталяваў сымбалічны помнік ксяндзу Адаму Станкевічу. Быццам не задумваўся: «А каму гэта патрэбна?» Быццам ня ведаў, што ці ня ўсе ягоныя сябры па Празе і Вільні памерлі не сваёй сьмерцю ў сталінскіх ды гітлераўскіх катоўнях, ня бачыў, што робяць зь беларускай культурай і мовай у БССР і што ягоная беларуская Вільня што ні год, то ўсё больш пераўтвараецца ў прыгожую казку.

Дык чаму ж да самага канца застаўся пры сваім? Што натхніла яго на такі самаадданы чын даўжынёй у семдзесят гадоў? Міхась Казлоўскі ў сваёй кнізе простага адказу не дае. Ды, мабыць, яго ніхто даць і ня зможа. Можа, гэта была сустрэча зь Янкам Купалам і Паўлінай Мядзёлкай, якія наведалі ягоныя родныя Клюшчаны летам 1914 г., можа, прыклад ягонага настаўніка і старэйшага сябра Кастуся Стаповіча, вядомага як паэт Казімір Сваяк, а можа, некалькі гадоў, праведзеных у Празе, калі туга па роднай Вільні рабілася нясьцерпнай. Мабыць, усё адразу з дадаткам моцнай веры, якая акурат надае чалавеку перакананасьці ў патрэбнасьці і наканаванасьці ягонай справы. «Для нас, што стаім пад сьцягам ня толькі народным, але і Хрыстовым, для нас чыннасьці нашы залежаць ад мэты, але ня могуць быць самамэтай. Як падвойнай для нас ёсьць мэта жыцьця: вечная і дачасная, так падвойнай мусіць быць і мэта людзкой чыннасьці», — напісаў А.Клімовіч яшчэ ў 1931 г. Гэтага прынцыпу маральнай ацэнкі ўсіх сваіх дзеяньняў, няважна, у палітыцы, грамадзкім ці асабістым жыцьці, ён трымаўся на працягу ўсёй сваёй жыцьцёвай дарогі. Мабыць, менавіта гэтага сёньня не хапае нам, загразлым у штодзённым цынізьме, танным усяведаньні, поўным пагарджаньні любымі аўтарытэтамі.

Новая кніга Міхася Казлоўскага — гэта не манаграфія для гістарычных штудыяў і не чытанка для адпачынку. Гэта кніжка для душы і роздуму, бо, дачытваючы яе, ня просіш для сябе ў Бога нічога, як толькі дазволу пражыць жыцьцё так, як пражыў сваё Адольф Клімовіч, — ва ўпорнай самаахвярнай працы, сумленна і ў згодзе з Богам і людзьмі, ні хвіліну не сумняваючыся ў правільнасьці абранага шляху.


Адольф Клімовіч.



**Казлоўскі, Міхась. Нашчадак слаўных крывічоў. Эцюд да партрэта Адольфа Клімовіча, чалавека і грамадзяніна.** — Менск: «Кнігазбор», 2008.

## Новая кніга сэрыі «Кнігарня «НН»



**Быкаў, В. Сьцяна. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008. — 350 с.**

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

## КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Гардзееў, Ю. Магдэбурская Горадня — Горадня-Ўроцлаў: Гарадзенскі «Рух «За Свабоду», Kolegium Europy Wschodniej. — 2008. — 384 с. — (сэрыя «Гарадзенская бібліятэка»)**

Глыбокая навуковая праца, якая мае ўсе рысы захапляльнага папулярнага тэксту, прычым цудоўна выдадзеная. Такім чынам, у выданьня ёсьць усе перадумовы для таго, каб быць купленым у кожны гарадзенскі дом. Вось толькі ці шырока прадаецца ў Горадні кніга, надрукаваная ва Ўроцлаве? Цудоўны пачатак сэрыі «Гарадзенская бібліятэка», які абяцае цудоўны працяг.

**Бічэль, Д. Хадзі на мой голас. — Горадня-Ўроцлаў: Гарадзенскі «Рух «За Свабоду», Kolegium Europy Wschodniej. — 2008. — 332 с.— (сэрыя Гарадзенская бібліятэка)**

Другое выданьне з сэрыі «Гарадзенская бібліятэка». Цікавыя і шчырыя мэмуары вядомай паэткі.

**Бічэль, Д. Ойча наш… Цыкль вершаў. — Менск: Про Хрысто, 2008. — 32 с.**

**Жарнасек, І. Шукаю цябе. Вершы. — Менск: Про Хрысто, 2008. — 80 с.**

**Чобат, А. Край мой шчасьлівы: Кніга тысячы радкоў для дзяцей і для бацькоў. — Менск: Про Хрысто. — 2007. — 72 с.**

Тры кнігі вершаў, выдадзеных у «Про Хрысто», зьвернутых да Бога і натхнёных малітвай.

**Вильна 1823—1824. Перекрестки памяти / Сост. Федута А. И. — Минск: Лимариус, 2008. — 244 с.**

У зборнік, прысьвечаны «справе філяматаў», увайшлі працы і ўспаміны сучасьнікаў тых падзей.

**Nie chyliłem czoła przed mocą / Чала я не хіліў прад сілай. Antologia poezji białoruskiej od XV do XX wieku / Укладаньне, рэдагаваньне Л. Баршчэўскі, А.Паморскі. — Wrocław: Kolegium Europy Wschodniej. — 2008. — 640 с. — (Białoruski program wydawniczy).**

Дзьвюхмоўная анталёгія беларускай паэзіі, вынік вялікай і таленавітай працы ўкладальнікаў і перакладчыкаў. Цудоўны падарунак тым, хто любіць і цэніць прыгожае пісьменства. Чытачы, якія валодаюць абедзьвюма мовамі, змогуць ацаніць якасьць перакладаў. З сэрыі «Беларуская выдавецкая праграма».

**Pępek nieba / Пуп неба. Antologia młodej poezji białoruskiej / Укладальнік і рэдактар А. Хадановіч. Рэдактар польскіх перакладаў А. Паморскі — Wrocław: Kolegium Europy Wschodniej. — 2006. — 214 с. — (Białoruski program wydawniczy).**

Дзьвюхмоўная анталёгія найлепшых вершаў маладых беларускіх паэтаў. Стыльна аздобленая малюнкамі Андрэя Пакроўскага. З сэрыі «Беларуская выдавецкая праграма».

**Aleksijewicz, S. Ołowiane żołnierzyki. — Wrocław: Kolegium Europy Wschodniej. — 2007. — 328 с. — (Biblioteka Białoruska).**

Па-польску выйшла вядомая кніга С.Алексіевіч «Цынкавыя хлопчыкі». З прадмовы да польскага выданьня С.Браткоўскага: «Алексіевіч… даказвае, што малады народ, у якога забралі дэмакратыю, перш чым яна здолела ўгрунтавацца, народ, у якога сёньняшняя ўлада спрабуе адабраць нават ідэнтычнасьць і мову і зноў зрабіць краіну калёніяй Расеі, гэты народ усё ж мае свабоду духу».

**Suplement poetycki ze współczesnej liryki białoruskiej. Wybor i redakcja Adam Pomorski. Przełożyli Jerzy Litwiniuk i Adam Pomorski. — Warszawa: Dom Kultury Śródmieście**. — 2008. — 142 с. **(Biblioteka kwartalnika «Tekstualia»**).

Цікавасьць да беларускай паэзіі ў Польшчы вельмі высокая! Пра гэта сьведчыць тое, што анталёгіі выходзяць адна за адной.

**ПК**

# Самая пасьпяховая

Вынікі Алімпіяды ў Пэкіне. Піша Зьміцер Панкавец.




На тое, што пэкінская Алімпіяда можа стаць самай пасьпяховай за ўсе гады, што незалежная Беларусь выступае асобнай камандай, не было асаблівых спадзяваньняў. Нават Міністэрства спорту і турызму ставіла досыць наземную плянку — 17 мэдалёў. І ўсе разумелі, што прагноз рабіўся з традыцыйным беларускім завышэньнем. Кажам сямнаццаць, у розуме трымаем дванаццаць, прыкладна так.

Спачатку, на фоне кітайскіх «звышлюдзей», якія штампавалі ўзнагароду за ўзнагародай, нават думалася, што гэтыя Гульні могуць стаць самымі правальнымі для нашай каманды. А тут яшчэ па чарзе «пасыпаліся» лідэры, на мэдалі якіх спадзяваліся — Натальля Цылінская, Аляксандра Герасіменя, Ігар Мартынаў, Вікторыя Чайка, Аляксандар Буйкевіч, Уладзімер Самсонаў, Рыта Турава, Віка Азаранка... Шэраг можна доўжыць. Не ўзялі золата Іван Ціхан, Надзея Астапчук, Андрэй Рыбакоў, Кацярына Карстэн. Першы тыдзень не прынёс нам ніводнага залатога мэдаля. Затое потым пачалося...

На вяршыню п'едэсталу ўзышлі тыя, на каго мала разьлічвалі. Андрэй Арамнаў, Вольга Мянькова, браты Багдановічы, байдарка-чацьвёрка. Ажно чатыры алімпійскія залатыя! Столькі ў нашых яшчэ не было ніколі. Да гэтага дадаліся яшчэ бліскучы выступ дзесяціборца Андрэя Краўчанкі, «срэбра» Іны Жукавай і «бронза» ў камандных практыкаваньнях па мастацкай гімнастыцы. Выніковае месца Жукавай сэнсацыйнае: добра вядома, наколькі мэдаль у гэтым спорце залежыць ад судзейскай кан'юнктуры.

Такім чынам, у выніковай скарбонцы нашай каманды 19 мэдалёў (у Атлянце было — 15, Сыднэі — 17, Афінах — 15). Па агульнай колькасьці ўзнагародаў мы занялі высокае трынаццатае месца, саступіўшы толькі спартовым звышдзяржавам. Па залатых мэдалях Беларусь шаснаццатая, таксама вельмі годны выступ. З нашых суседзяў больш каштоўнага мэталу з Кітаю прывезьлі толькі расейцы і украінцы. Для параўнаньня, Польшча заваявала толькі дзесяць мэдалёў, Літва — 5, Латвія — 3, Эстонія — 2. Па колькасьці мэдалёў на душу насельніцтва беларусы ўвогуле шостыя, саступаючы Ямайцы, Аўстраліі, Багамам, Ісьляндыі і Кубе.

Разам з тым, зьвяртае на сябе ўвагу, што ўсе мэдалі былі ўзятыя ў невялікай колькасьці алімпійскіх дысцыплінаў — цяжкая атлетыка (3), кіданьне молату (3), штурханьне ядра (3), веславаньне на байдарках і каноэ (3), акадэмічнае веславаньне (2), барацьба вольная і грэка-рымская (2), мастацкая гімнастыка (2), дзесяціборства (1).

І гэта з 39 відаў спорту, уключаных у алімпійскую праграму. Абсалютна правальным для нашай каманды было плаваньне, дзе разгульвалася ажно 34 камплекты ўзнагародаў. Не атрымалася зачапіцца ў стральбе, фэхтаваньні, дзюдо, спартовай гімнастыцы, вэляспорце, боксе. Гэта, так бы мовіць, хатняе заданьне на найбліжэйшыя чатыры гады, да лёнданскай Алімпіяды.

Варта адзначыць выступ баскетбалістак. Першы ж раз на Алімпіядзе выступаем у гульнявых відах спорту. З аднаго боку, дзяўчаты занялі досыць высокае шостае месца, а зь іншага, асэнсаваньне — магло быць і лепей. Калі ня выхад у фінал, дык матч за трэцяе месца быў цалкам рэальны. Дзяўчаты самі прызнаюцца, што ў гульнях з расіянкамі і кітаянкамі, прайгралі не супернiцам, а самім сабе. Зрэшты, каманда Анатоля Буяльскага чарговы раз пацьвердзіла, што па праве ўваходзіць у сусьветную эліту.

З прыемных тэндэнцый Алімпіяды — мэдалі ў нашую скарбонку прынесьлі амаль выключна дамарослыя спартоўцы. Выключэньні — Мурад Гайдараў (Дагестан) і Іна Жукава (Краснадарскі край).

Цікава, ці паставяць крыж на практыцы прывозу легіянэраў у боксе? Бо на гэтай Алімпіядзе прадстаўнікі зборнай Беларусі ня выйгралі ніводнага бою.

Калі ня браць у разьлік каманду гімнастак, дзе ўсе, апроч Алесі Бабушкінай, мянчанкі, то большую частку мэдалёў нам прынесьлі ўраджэнцы невялікіх гарадоў і вёсак. Барысаў — Андрэй Арамнаў і Андрэй Абалмасаў, Магілёў — Андрэй Рыбакоў, Жодзіна — Настасься Новікава, Крычаў — Аксана Мянькова, Слонім — Іван Ціхан, Наваполацак — Вадзім Дзевятоўскі, Столін — Надзея Астапчук, Ворша — Натальля Харанэка-Міхневіч, Бабруйск — Андрэй Міхневіч, Крупкі — Кацярына Карстэн, Мазыр — Натальля Гелах, Артур Літвінчук, Калінкавічы — Раман Петрушэнка, Асіповічы — браты Багдановічы, Петрыкаў — Андрэй Краўчанка. Прадстаўніцтва Заходняй Беларусі выглядае значна больш сьціплым за Ўсходнюю.

Пэўна, што пасьля такога пасьпяховага выступу на пасадзе міністра спорту застанецца Аляксандар Грыгараў, хаця перад пачаткам Гульняў ягоная адстаўка разглядалася амаль як справа вырашаная.

Пры ўсіх праблемах відавочна, што пэкінскія Гульні прынесьлі для Беларусі значна болей пазытыўных эмоцый. Беларусь даказала, што ўваходзіць у лік самых спартовых краінаў сьвету. Зрэшты, адпачываць на ляўрах не выпадае. Для многіх спартоўцаў ужо сёньня пачалася падрыхтоўка да Лёндану-2012.

**Зьміцер Панкавец**

## Інтымнае жыцьцё ў Алімпійскай вёсцы

На час спаборніцтваў алімпійская вёска ператвараецца ў сэкс-фэст, дзе залаты мэдаль — ключ да сэрцаў і пакояў тваіх жа супернікаў. На старонках брытанскай The Times колішні чэмпіён Англіі па настольным тэнісе й камэнтатар Мэт'ю Рыс раскрыў таямніцы інтымнага жыцьця алімпійцаў.

«Упершыню я ўдзельнічаў у Алімпіядзе ў Барсэлёне ў 1992 годзе, і за тыя два з паловай тыдні ў мяне было болей полавых партнёраў, чым за ўсё неалімпійскае жыцьцё».

Паводле слоў спартоўца, для многіх алімпійцаў Барсэлёна стала такім жа сымбалем сэксу, як і сымбалем спорту: вабныя шынкаркі й асыстэнткі ў кароткіх чорных спадніцах, захопленыя паклоньніцы на трыбунах і спартоўкі з тонкім станам. Ня толькі хлопцы змагаліся з сваёй увесьчасная юрлівасьцю — жанчыны проста праменіліся гармонамі, кідаючы прагныя пагляды на атлетаў і дорачы ўсьмешкі, як канфэці.

Чым патлумачыць такія вольнасьці? Папершае, тысячы прыгожых маладых людзей аказваюцца разам. Па-другое, у якасьці допінгу многія спартоўцы выкарыстоўваюць тэстастэрон, які павышае рэакцыю і вынослівасьць, гэты самы гармон адказвае за полавую актыўнасьць. Па-трэцяе, сам факт адрыву ад звыклае абстаноўкі і падарожжа ўзбуджае.

Улады Пэкіна прынялі да ўвагі надмерную сэксуальную актыўнасьць спартоўцаў. Пастаяльцам 90 тысяч нумароў 424 гарадзкіх гатэляў раздалі 400 тысяч бясплатных прэзэрватываў. Яшчэ 100 тысяч прэзэрватываў з буклетамі пра ВІЧ-інфэкцыю бясплатна распаўсюджваліся ў клініцы Алімпійскае вёскі.

**Паводле The Times**

### Беларуска загінула ў ДТЗ у Эгіпце

24 жніўня ў Эгіпце разьбіўся турыстычны аўтобус, у якім знаходзіліся чацвера грамадзянаў Беларусі, што адпачывалі на курорце Таба. У ДТЗ загінуў эгіпцянін-ахоўнік, адна зь беларусак ад атрыманых траўмаў памерла ў бальніцы. Аўтобус, які ехаў у Каір, сутыкнуўся ў грузавіком на хуткаснай аўтатрасе.

### 37 чалавек атруціліся грыбамі, трое памерлі

Больш за ўсё ахвяраў лясных дарункаў у Менску — 22 чалавекі. Трох чалавек з сталіцы, Гомельскай ды Гарадзенскай абласьцей дактары выратаваць не змаглі. Усе пацярпелыя цьвердзілі, што спажывалі толькі ядомыя грыбы.

### Ля вёскі Марусенька цягнік зьбіў 24 рагулі

Ля вёскі Марусенька Жлобінскага раёну 24 жніўня цягнік Сімфэропаль — Менск забіў статак кароваў, якія выйшлі на рэйкі. Загінулі 24 рагулі.

### Пад Высокім затрымалі зборшчыкаў канопляў

За парушэньне правілаў знаходжаньня ў памежнай зоне пагранічнікі затрымалі трох грамадзянаў Беларусі. Затрыманыя зьбіралі дзікія каноплі. Усяго ў іх было сканфіскавана 4,5 кг гэтай расьліны.

### Ты мне ня нравішся — у ЛТП

Участковы Іванаўскага РУУС на глебе непрыязнага стаўленьня сфальсыфікаваў дакумэнты, паводле якіх суд Іванаўскага раёну вынес рашэньне накіраваць чалавека на прымусовае лекаваньне ад алькагалізму, хаця той меў пастаяннае месца працы, дзе станоўча характарызаваўся. Па пратэсьце пракурора раёну рашэньне суду адменена. На ўчастковага інспэктара распачатая крымінальная справа за злоўжываньне ўладай.

### У Туркмэністане скасавалі рухнамазнаўства

З 1 верасьня ў тукрмэнскіх ВНУ будзе скарочанае вывучэньне «Рухнамы», напісанай колішнім прэзыдэнтам краіны Сапармуратам Ніязавым. Новы прэзыдэнт Туркмэніі Гурбаргулы Бэрдымухамэдаў разьвітваецца з спадчынай Туркмэнбашы. З цэнтру Ашхабаду прыбраная пазалочаная статуя Ніязава. Бэрдымухамэдаў вярнуў туркмэнам балет і інтэрнэт, але забараніў насіць гальштукі свайго улюбёнага чырвонага колеру.

### У Сэрбіі паставілі помнік Бобу Марлі

Драўляная статуя легендарнага рэгі-музыкі зьявілася ў сэрбскай вёсцы Банацкі Сокалач, дзе нядаўна завяршыўся фэстываль Rock Village за мір на Балканах. Арганізатары кажуць, што ураджэнец Ямайкі Боб Марлі прапагандаваў у сваёй музыцы мір і талерантнасьць. Статуя адлюстроўвае Марлі з гітарай і ўзьнятым уверх кулаком правай рукі.

У краінах былой Югаславіі трыдцыця ўшанаваньня зорак шоўбізнэсу набірае моц. Жыхары сэрбскай вёскі, Жыцістэ, паставілі помнік легендарнаму Рокі. Ён мае ратаваць вёску ад пастаянных паводак, бо жыхары мяркуюць, што іхную вёску нехта сурочыў. У басьнійскім горадзе Мостар паставілі помнік Брусу Лі ў знак непрыняцьця падзелу паводле этнічнай прыкметы, празь якую там у 1990-я адбылася крывавая вайна.

**Паводле Cz; naviny.by, BBC, радыё «Свабода», BulletinOnline**

## ПРЭМ’ЕРА

**«Дзень Волі» ў Гомелі і Магілёве**

Па краіне адбываюцца паказы дакумэнтальнага фільму «Дзень Волі», зьнятага на замову тэлеканалу «Белсат». Цягам фільму гісторык і літаратар Уладзімер Арлоў нясьпешна вандруе па часе і інтэрнэце, сустракаючыся з самымі рознымі людзьмі — ад наркома Чычэрына да Івонкі Сурвіллы.

**У Гомелі** «Дзень Волі» пакажуць **31 жніўня а 19-й па адрасе вул.Палеская, 52; у Магілёве — 2 верасьня а 18-й у сядзібе МГА «Кола сяброў».** Пазьней фільм пакажуць **у Віцебску і Горадні**.

## ВЫСТАВЫ

**NAVINKI-2008**

**З 29 да 31 жніўня ў Палацы мастацтва і 1 верасьня на Вячы** — Міжнародны фэстываль пэрформансу NAVINKI-2008 з удзелам масткоў-артыстаў Нямеччыны, Японіі, Польшчы, Сынгапуру, Швэцыі, Швайцарыі, Ангельшчыны, ЗША, Аўстраліі і Беларусі. Акрамя новых сустрэчаў на фэсьце можна наведаць адкрытыя майстаркласы ў праграме «NAVINKI-WELD сустрэчы з пэрформансам», а **11—14 верасьня** фэст працягнецца **ў Стакгольме** як Navinki-Weld Performance Meetings.

**Жывапіс сучасных беларускіх мастакоў**

**З 1 да 13 верасьня ў мастацкай галерэі «ЛаСандрарт» (Раманаўская слабада, 24)** працуе выстава «Жывапіс сучасных беларускіх мастакоў».

**Залаты фонд Беларускага саюзу мастакоў**

**У Палацы мастацтва да 31 жніўня** працуе выстава «Залаты фонд Беларускага саюзу мастакоў», на якой можна ўбачыць больш за 200 твораў клясыкаў беларускай школы жывапісу. Сярод аўтараў — Віталь Цьвірко, Віктар Грамыка, Леанід Шчамялёў, Мікалай Селяшчук, Гаўрыіл Вашчанка, Аляксандар Кішчанка ды іншыя. Большасьць твораў доўгі час нідзе не экспанавалася.

**Вогненныя пісьмёны**

**У Мастацкім музэі да 21 верасьня** працуе выстава керамікі «Вогненныя пісьмёны».

**Заснавальнікам БНР**

**У сядзібе БНФ** працуе выстава партрэтаў дзеячаў БНР, якія галасавалі за абвяшчэньне незалежнасьці рэспублікі. Выстава складаецца зь літаграфіяў і графікі — у цэлым больш чым 40 твораў. Сярод аўтараў — Мікола Купава, Анатоль Крывенка, Мікола Несьцярэўскі і іншыя.

## КАНЦЭРТЫ

**Рок па вакацыях**

**31 жніўня а 18-й у КЗ «Менск»** — «Рок па вакацыях». Бяруць удзел: **«Крама», ULIS, Neuro Dubel, «Грунвальд», «Куклы», «Фляўс і Кляйн», «Детидетей», Tlusta Lusta**. Уваход толькі (!) па запрашальніках (рэгістрацыя праз «Тузін Гітоў» www.music.fromby.net).

**Усе пад Воршай, а Neuro Dubel у «Графіці»**

**8 верасьня**, у Дзень беларускай вайсковай славы, **менская закусачная «Графіці» (зав.Калініна, 16)** распачынае новы канцэртны сэзон. Зайграюць рок-каралі — Neuro Dubel. **Пачатак а 20.00.** Даведкі праз т.:(029) 671-58-65, 254-49-09.

**Вайцюшкевіч адкрывае сэзон**

**9 верасьня ў «Графіці»** — «Восеньскі канцэрт» Зьмітра Вайцюшкевіча. **Пачатак а 20-й.**

**Джаз на цымбалах**

**4 верасьня ў Вялікай залі Філярмоніі** — канцэрт **Folk-Juzz-Modern «M-Side Trio»** ў складзе Міхаіла Лявончыка (вугорскія і беларускія цымбалы), Аляксандра Лявончыка (фортэпіяна) і Мануэля Да Коль (ударныя). **Пачатак а 19-й.**

**Пятро Гарадзенскі**

**31 жніўня ў гарадзенскім Тэатры Лялек** адбудзецца сольны канцэрт Пятра Гарадзенскага. Малады і таленавіты выканаўца прадставіць новую праграму з альбому For All. Як можна зразумець з назвы кружэлкі, музыка Пятра адрасаваная ўсім. Ён ствaрае кампазыцыі ў разнастайных стылях: ад хард-року і джазу, да рэгі і баса-новы. Якасны жывы гук і сапраўднае шоў. Кошт білетаў 10 000 руб. **Пачатак а 19-й.**

## ГІСТАРЫЧНЫЯ СЭМІНАРЫ

**Таварыства беларускай мовы запрашае на гістарычныя сэмінары**

**18 і 25 верасьня.** Ігар Кузьняцоў «Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі: гісторыя і сучаснасьць», офіс ТБМ **(завулак Румянцава, 12), 18.00.**

**21 верасьня.** Уладзімер Арлоў «Гістарычныя ваколіцы Менску», **Палац мастацтваў (вул.Казлова, 3), 18.00.**

**27 верасьня.** Анатоль Грыцкевіч «Гістарычная тапаніміка і тапаграфія Менску. Старажытны Менск», офіс ТБМ, **18.00.**

# Аршанская бітва — 2008



**ФЭСТ БЕЛАРУСКАЙ АЎТАРСКАЙ ПЕСЬНІ Й ПАЭЗІІ** «Аршанская бітва—2008» пройдзе Н**А КРАПІВЕНСКІМ ПОЛІ 6 ВЕРАСЬНЯ. Фэстываль ПАЧНЕЦЦА А 18-Й** на гістарычным месцы Аршанскае бітвы 1514 году — левым беразе Дняпра пры ўпадзеньні ў яго рэчкі Крапівенкі. Праходзіць ён **НА АДКРЫТЫМ ПАВЕТРЫ**, таму варта падумаць пра адпаведную вопратку, запас ежы і намёт. Запас дроваў для вогнішча будзе на месцы.




**Даезд:**

з чыгуначнага вакзалу на аўтобусе ці маршрутцы № 11 да аўтавакзалу (канец маршруту). Далей — аўтобусам «Ворша — Дуброўна» да прыпынку «Гацькаўшчына». Гуртам можна наняць маршрутку з чыгуначнага вакзалу проста да Гацькаўшчыны.

Таксама аўтобусам або маршруткай можна ад’ехаць ад прывакзальнае плошчы да прыпынку «Цэнтар», затым ад Цэнтральнай плошчы, што ля «Дому гандлю» (прыпынак за помнікам Леніну), можна сесьці на аўтобус ці маршрутку «Ворша — Дуброўна» і ехаць да прыпынку «Гацькаўшчына». Ад прыпынку «Гацькаўшчына» да месца фэсту каля 1 км.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Забойцы ў правінцыйным гарадку

**Залегчы на дно ў Бругe** (In Bruges)

Вялікабрытанія — Бэльгія, 2008, каляровы, 107 хв.

**Рэжысэр:** Марцін МакДонах

**Ролі выконваюць:** Колін Фарэл, Брэндан Глісан, Ральф Файнз, Клеменс Поэзі, Джордан Прэнціс, Элізабэт Бэрынгтан

**Жанр:** Драма

**Адзнака:** 8 (з 10)

Пасьля таго як два кілеры-недарэкі Рэй і Кен выпадкова застрэлілі хлопчыка іхны шэф Гары адпраўляе герояў залегчы ў Бругe. У ціхім бэльгійскім гарадку, сярод сярэднявечных помнікаў Кен нечакана атрымлівае заданьне забіць свайго напарніка…

Карціна Марціна МакДонаха — годнае эўрапейскае кіно, дзе мэлянхолія зьмешваецца з іроніяй, нетаропкасьць выбухае экшанам, сюжэтныя павароты і забаўляюць, і скаланаюць, а акторскія дыялёгі бліскучыя.

Колін Фарэл у ролі Рэя пацьвердзіў свой статус глыбокага актора, здольнага на рэзкія жэсты й тонкія псыхалягічныя нюансы. Ральф Файнз дадаў да галерэі сыграных ім ганарлівых псыхапатаў калярытнага прыдурка-брыдкаслова, а Брэндан Глісан (Кен) выдатна разыграў ролю флегматычнага турыста-кілера.

Пасьля гэтага фільму маленькі бэльгійскі гарадок можа цалкам разьлічваць на большую колькасьць цікаўных гасьцей. Але эўрапейская стужка ня толькі надзвычай удалы рэклямны буклет.

За маналітным мурам гангстэрскага кіно — датклівасьць і згрызоты сумленьня. За цішынёй і вечаровым сьмехам — прабег з наганам па вуліцы (ашаламляльная сцэна). А сам нудны гарадок, у якім нічога не адбываецца, нагадвае пекла, у якім ажываюць героі Босха.

Падае сьнег у калядную ноч. Вандроўка двух кілераў — традыцыйных пэрсанажаў сучаснага кіно — у горад Бругe стаецца дасьціпным аповедам пра пакаяньне.

**Андрэй Расінскі**

# Вяртлявая кугукаўка, барадатая чаротаўка, кандыдат палатачны...

ЛЕВЫМ ВОКАМ



Заява Ярмошынай аб тым, што прычыны скарачэньня колькасьці кандыдатаў у Палатку «натуральныя», дазваляюць разглядаць іх як асаблівы падвід фаўны, якому тэрмінова трэба абарона. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

*Карла Маркса, 38*

**Чыноўнік з Кобрыні:** Добры дзень. Я да вас зь бядой: у нас там адзін зьбіраецца балятавацца ў Палату прадстаўнікоў… Вось хацеў бы атрымаць ліцэнзію на тое, каб не пусьціць яго ў кандыдаты. Разрывам кантракту папалохаць, ці яшчэ што…

**Чыноўнік з Адміністрацыі:** Афігець! Спэцыяльна для Вас цытую Чырвоную кнігу *(бярэ кнігу і чытае)*: «Кандыдат палатачны. Водзіцца на выбарчых участках. У краіне налічваецца прыкладна 350 асобінаў. Праз катастрафічнае скарачэньне папуляцыі, выкліканае натуральнымі прычынамі, знаходзіцца на ўліку Цэнтральнага Выбарчага Камітэту пра Мінэкалёгіі. Здымаць толькі з дазволу ўладаў». *(Згортвае кнігу)*. Чулі? Кандыдатаў засталося менш, чым вяртлявых чаротавак, а Вы маладняк зьнішчаеце! Вы ж бачылі рэклямны ролік: «Чорная чапля, кандыдат ў Палату… Яны мусяць жыць!».

**Чыноўнік з Кобрыні:** Пачакайце, а як жа пітомнік кандыдатаў пры лібэральна-дэмакратычнай партыі?

**Чыноўнік з Адміністрацыі:** Там нейкі мор, ці што. У гэтым сэзоне толькі сем гадаванцаў і тыя такія кволыя.

**Чыноўнік з Кобрыні:** А за мяжой кандыдатаў набываць ня думаеце?

**Чыноўнік з Адміністрацыі:** А сэнс? Вы ж чыталі, што кіраўнік ЦВК кажа: дэфіцыт выкліканы натуральнымі прычынамі! Што мы можам зрабіць супраць глябальнага пацяпленьня, выбухаў на Сонцы або зруху тэктанічных плітаў? Вымiраюць, падлы.

**Чыноўнік з Кобрыні:** Што ж рабіць? Ён жа кандыдатам стане, шкоды ў горадзе наробіць.

**Чыноўнік з Адміністрацыі:** Во з гэтага і трэба было пачынаць. Які канкрэтна ўрон Ваш кандыдат можа нанесьці гораду і раёну: пачне грызьці дрэвы, красьці хатніх і калгасных жывёлаў, кусаць прахожых, выць на Месяц, замінаючы грамадзянам адпачываць пасьля працоўнага дня?

**Чыноўнік з Кобрыні:** Дык ад ягоных жа ўлётак столькі сьмецьця будзе ў паштовых скрынях! І потым, ён кандыдата ад вэртыкалі напалохае. А ён у нас такі ручны! І потым гэта ж ягоны арэал распаўсюджаньня.

**Чыноўнік з Адміністрацыі:** М-да. Тут выпадак выключны. Гэта можна разглядаць у кантэксьце працэсу эвалюцыі. У такім выпадку мы, эколягі і сэлекцыянэры, натуральна, зацікаўленыя ў тым, каб выжыў кандыдат, які ўжо адаптаваўся да ўмоваў мясцовасьці. Давайце так: я Вашую заяву на ліцэнзію падпішу. Аднак Вы за гэта павінны стварыць на Вашым прадпрыемстве пры БРСМ або прафсаюзах сэкцыю юных натуралістаў і да наступных выбараў выгадаваць двух паўнацэнных кандыдатаў.

**Чыноўнік з Кобрыні:** Дзякуй! *(Сыходзіць)*

**Чыноўнік з Адміністрацыі** *(усьлед)*: Толькі не карміце іх байкамі пра тое, што ў нас чэсныя выбары. Інакш адзічэюць, як той Скрабец. Гадавалі, гадавалі, а ў выніку... Вам што, а ў мяне, эколяга і сэлекцыянэра, дагэтуль душа баліць.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

**А.Б.** з Капыльскага раёну.
**Аляксандру А.** з Магілёва.
**Міхаілу Ш.** з Клімавіцкага раёну.
**Генадзю К.** з Горадні.
**Леакадзіі Н., Ігару С.** з Валожынскага раёну.
**А.П., Паўлу Ч., І.М., Вячаславу К., Анатолю С., Андрэю К., Сьвятлане Р., Сяргею У., Кірылу М., В.Х., Вользе С., Зьмітру М., Леаніду Г., Уладзімеру З., Юр’ю Л., Аляксею Ш., Марату К., Андрэю С.** зь Менску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764
Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак
(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764
Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак
(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Пецярбург.** Сынод, каторы ў 1901 годзе адлучыў ад царквы Льва Талстога і аб’явіў яму сваё пракляцьце, цяпер, перад сьвяткаваньнем дня нараджэньня яго, напісаў ваззваньне, каб ніхто з праваслаўных не належаў да сьвяткаваньня пад страхам суду Божага.

**«Наша Ніва». № 18. 1908**

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, аднолўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 27.08.2008.
Замова № .
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.